№ 4 (58)/2006

# Беларускія Ведамасьці

НЬЮ-ЁРК -- ВАРШАВА, ліпень – верасень 2006 г.



*Менск, ліпень 2006 г. Звычайны антыбеларускі рэжым*

## АЛЬТЭРНАТЫВАЙ РЭЖЫМУ ЁСЬЦЬ ЗМАГАНЬНЕ

***(Выступ на жніветськім Сойме БНФ)***

Аналіз фактаў і заяваў паказвае, што Масква рыхтуецца да нейкіх маштабных падзеяў у Беларусі. Пасьля выбараў на трэці тэрмін адчувальна павялічылася вынішчэньне ўсяго беларускага; прытым у сваіх антынацыянальных дзеяньнях рэжым стаў дзейнічаць цалкам адкрыта па тыпова акупацыйнай схеме. Відавочнае прысьпешваньне курсу на зьнішчэньне беларускай грамадзянскай супольнасьці; адбываецца ня тое што перасьлед, а паляваньне на беларускую моладзь. Падыходы цалкам нагадваюць схемы НКВД у 30-х гадах па вынішчэньні беларушчыны. Усё гэта, плюс брутальнасьць дзеяньняў міліцыі, дэманстрацыя поўнага бяспраўя рэжымнай уладай мае на мэце (як мне падаецца) растаптаць да рэшты і без таго слабы дух людзей, замацаваць страх на ўзроўні поўнай бязвыходнасьці перад падзеямі нацыянальнай важнасьці і рэжымнай ініцыятывы.

Рыхтуюць ня толькі грамадзтва, але і рэжымную ўладу і галоўнага начальніка гэтай улады. Сімптаматычна, што перад выбарамі ды рэфэрэндумамі заўсёды паяўляецца ў Менску гэты цёмны паяц Павел Глоба і бармыча пра Лукашэнку свае лубянскія заклінаньні. Апошняя ягоная антрэпрыза нагадвае вытрымкі зь Ільфа і Пятрова. „Беларусь ёсьць цэнтрам Эўропы, – кажа гэты Бэндар, – яна трымае вось раўнавагі ва ўсёй эўрапейскай сістэме”. „Зьявілася адзіная моцная харызматычная асоба”, якую „Гасподзь Бог паставіў кіраваць гэтай краінай. Я кажу пра Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнку”.

Нарэшце! А мы так чакалі, калі ж, калі паявіцца вышэйшы лубянскі пілатаж. Зьявіўся! Наступны этап – сын Божы. А там... хто ведае...

Для паўнаты карціны працытую кавалак глобскага сьпічу цалкам і ў арыгінале.

„Он (Лукашэнка) родился на берегу Днепра. Это центральная река для всего славянского этноса. Как Кий, эпический основатель Киева, как княгиня Ольга. Это символично, ведь река считается переходом из царства живых в царство мёртвых. Плюс ко всему президент Беларуси родился в той

самой Александрии, где в своё время, в десятом веке, умер первый епископ российской земли, которого называли Лука!

Карэспандэнт: – Какая связь имён…

Глоба: – Да. Лукашенко родился почти через тысячу лет после смерти епископа Луки. Он пришёл к власти в то время, когда на небе наблюдалось редчайшее явление – на Юпитер упала комета, которая раскололась на 22 куска, когда развалился на куски Союз. И Лукашенко, кстати, не подписал акт о развале Союза. Потому что он – один из тех, кому будет поручено стать предвестником объединения расколотых земель.

Карэспандэнт: – Для этого потребуется время. (правільна задае пытаньне карэспандэнт).

Глоба: – Времени у него будет достаточно".

Ня трэба думаць, што гэтая прымітыўная і камічная „бздура", надрукаваная інтэрнэт-газэтай „Обозреватель", вынік хворай сьвядомасьці. „Отнюдь", – як пісалі расейскія знаўцы. Гэтае казаньне якраз разьлічана на хворую сьвядомасьць, якая верыць таму, што сказана, і з хваляваньнем успрымае. Тым больш, што „времені у него будет достаточно".

Глобская гастроль безумоўна зьвязана з расейскімі плянамі прысьпешваньня „інтэграцыі" і „канстытуцыйнага акту" так званага „союзного государства". Гэбэ зноў узялося апрацоўваць кліента мэтадам клінічнай псіхалёгіі. Вопыт паказвае, што Масква ставіць сур'ёзныя задачы.

Падстаўная прамаскоўская псэўдаапазыцыя цалкам адпрацавала сваю службовую ролю на апошніх выбарах. Лукашэнка замацаваўся на трэці тэрмін і „апазыцыянэрамі" пакуль што не цікавяцца. Нават у Маскву не запрашаюць. Пасьля зрабленьня справы згодна імпэрскай традыцыі, Масква заўсёды кідала сваіх выканаўцаў як адпрацаваны матэр'ял, бо Крэмль не зацікаўлены ствараць у Беларусі нейкія рэальныя пункты канцэнтрацыі палітычнай сілы і разграбаць потым рэшткавыя праблемы сваёй палітыкі. Так зьнік у багне гэтай маскоўскай паліттэхналёгіі (якую Крэмль надта і не хавае) цэлы шэраг палітычна нявырабленых людзей, якія мелі амбітныя задумкі і хацелі верна супрацоўнічаць з Расеяй ( В. Ганчар, М. Чыгір, Г. Карпенка, В. Лявонаў, М. Марыніч, А. Казулін). Наступнымі пасьля зрабленьня прамаскоўскай справы і „адпрацоўкі" будуць „кінутыя" А. Мілінкевіч, С. Калякін і г.д.

На супрацоўніцтва з гэбісцкай Расеяй у гэтых паўваенных абставінах ідуць людзі, якія не былі і ня ёсьць улучаныя ў беларускую нацыянальную палітыку, ня выйшлі яшчэ з сьведамасьці расейскай імпэрыі, з СССР, ня ўспрымаюць беларускія нацыянальныя інтарэсы і наўрад ці ўсьведамляюць сутнасьць і зьмест гістарычнага расейска-беларускага канфлікту. У той час калі ўся Расея, пачынаючы ад яе прэзыдэнта і КГБ і канчаючы „дзеячамі культуры", змагаецца за інкарпарацыю („ об'единение", „интеграцию") нашай краіны і ўлучэньне яе ў расейскую дзяржаву ды яшчэ абапіраецца на свой прамаскоўскі рэжым на Беларусі. У гэтакай сітуацыі палітычнае супрацоўніцтва з Расеяй (супраць прамаскоўскага Лукашэнкі) ёсьць альбо абсурд адсталасьці і поўнай сьлепаты, альбо здрада і калябарацыя. Зрэшты, тут і адно, і другое.

Існуе небясьпека, што Масква і антыбеларускія сілы ў Беларусі выкарыстаюць бліжэйшыя выбары ў мясцовыя органы ўлады для правядзеньня інкарпарацыйнага рэфэрэндуму аб „канстытуцыйным акце" незаконнага так званага „союзного государства".

Беларускі і сусьветны вопыт неаднаразова пацьвердзіў, што пад акупацыйным рэжымам і дыктатурай ня можа быць справядлівых выбараў, бо вышэйшым крытэрам такіх выбараў ёсьць не закон, а некантраляваная народам злая воля палітычнае ўлады. Удзельнічаць у такіх выбарах нельга. Трэба пазбавіць рэжым магчымасьці прыкрывацца народам у сваёй хлусьні. Няхай ашуканства стане ўсім наглядна відаць. Тады сіла і магчымасьці такой улады хутка зьмалеюць. Барацьба – гэта працэс, і нішто ня зробіцца на Беларусі адным махам.

Практыка паказала, што людзі, якія ў беларускіх абставінах заклікалі пад выглядам агітацыі ісьці галасаваць па правілах рэжымнай машыны ўлады, людзі гэтыя ў рэальнасьці спрыялі рэжыму ў дасягненьні патрэбных яму вынікаў.

Альтэрнатывай супраць гэтай шкоднай інэрцыі ёсьць змаганьне. Бяз волі і барацьбы нічога не дасягаецца, асабліва ў палітыцы. На выбары ісьці нельга. Але трэба рыхтавацца да рашучага змаганьня. У дзень галасаваньня трэба ісьці не на выбарчыя ўчасткі галасаваць для рэжыму, а выходзіць на вуліцы і плошчы, яднацца ў пратэстах і дзеяньнях. Тады выявяцца і будуць сапраўдныя беларускія змагары і сапраўдныя беларускія арганізатары. Наша Партыя і ўвесь Народны Фронт павінны бачыць такую пэрспэктыву барацьбы і рыхтавацца да яе.

Надыходзіць 15-я гадавіна вяртаньня Незалежнасьці Беларусі. 25 жніўня як і 25 сакавіка – найвялікшы дзень нашай беларускай гісторыі. Яго трэба адзначыць годна і высакародна, нягледзячы ні на якія абставіны акупацыйнага рэжыму. Мяркую, што ў будучыні ў вольнай Беларусі 25 жніўня будзе адзначацца народам як найвялікшае сьвята Беларускай нацыі.

Зыходзячы з галоўнай тэмы нашага сёньняшняга паседжаньня, намі (Паліткамітэтам) падрыхтаваны тэкст заявы Сойму Партыі БНФ, які я прапаную абмеркаваць і прыняць на Сойме як стратэгічны дакумант, які выяўляе нашу палітычную пазыцыю на бліжэйшы час. З гэтай пазыцыі будзе выпрацавана і наша тактыка.

Зь медыцыны і электронікі мы ведаем, што вірусы нясуць вельмі вялікую небясьпеку і шкоду арганізму. Змаганьне зь вірусамі непазьбежнае. Але памятайма, што зацыкліваццa толькі на падстаўной апазыцыі нельга, бо ёсьць больш небясьпечныя ворагі Беларусі. Гэта рэжым і асабліва тое, што стаіць за яго плячыма – маскоўскі гэбізм і імпэрыялістычная палітыка. У выпрацоўцы тактыкі ёсьць магчымасьці выкарыстаць на пэўных участках змаганьня падстаўную апазыцыю супраць рэжыму і нават рэжым супраць Масквы. Але ўсё гэтае вымагае вялікай дакладнасьці і кіруемасьці, а значыцца і палітычнае сьпеласьці нашай фронтаўскай партыі.

***Зянон Пазьняк***

*13 жніўня 2006 г.*

# НЕ ГАЛАСАВАЦЬ ДЛЯ ДЫКТАТУРЫ, А ЯДНАЦЦА ЗА БЕЛАРУСЬ

***(Заява)***

Пасьля незаконных выбараў прэзыдэнта ў сакавіку гэтага года антыбеларуская палітыка рэжыму Лукашэнкі стала набіраць што раз больш адкрытыя і акупацыйныя формы. Галоўныя яе рысы: перасьлед беларускай моладзі, судовыя расправы, ліквідацыя беларускіх установаў і арганізацыяў культуры і агулам – выкананьне маскоўскіх установак па зьнішчэньні нацыянальнай грамадзянскай супольнасьці ў Беларусі.

Прысьпешваньне разбуральных працэсаў выклікана надыходзячым крызісам улады ў Расеі і ў цэлым яе агрэсіўнай палітыкай, накіраванай на падпарадкаваньне і інкарпарацыю Беларусі ў Расею. Галоўным інструмэнтам такой палітыкі на цяперашнім этапе Расея лічыць увядзеньне на Беларусь расейскага рубля і прыняцьце так званага „канстытуцыйнага акту" на чарговым рэфэрэндуме, які дазволіў бы зьмяніць існуючую канстытуцыю і стварыць фармальна-прававыя магчымасьці для інкарпарацыі.

Існуе небясьпека, што Масква і антыбеларускія сілы ў Беларусі выкарыстаюць бліжэйшыя выбары ў мясцовыя саветы для правядзеньня інкарпарацыйнага рэфэрэндуму аб „канстытуцыйным акце".

Беларускі і сусьветны досьвед неаднаразова пацьвердзіў, што пад акупацыйным рэжымам і дыктатурай ня можа быць справядлівых выбараў, бо вышэйшым крытэрам такіх выбараў ёсьць не закон і ня права, а некантраляваная народам злая воля палітычнае ўлады. Удзельнічаць у такіх выбарах нельга.

Сярод поўнага бяспраўя, цынізму, стаўкі на рэпрэсіі, на сілу і хлусьню ў народа, аднак, застаецца эфектыўная магчымасьць рэалізаваць свае адносіны да рэжыму – не хадзіць на ягоныя выбары. Няхай рэжым гуляе сам з сабой і абвяшчае пра 83 адсоткі сваёй „перамогі". Фальшаваньні рэжыму абапіраюцца на выбаршчыкаў, што ўдзельнічаюць у галасаваньні. Таму

трэба пазбавіць рэжым магчымасьці прыкрывацца народам у сваёй хлусьні. Няхай ашуканства стане ўсім наглядна відаць. Супраціў і непрыняцьце рэжыму ў форме актыўнага няўдзелу ў яго „выбарах” прысьпешыць канец дыктатуры і нацыянальную кансалідацыю беларускага грамадзтва.

Практыка паказала, што людзі, якія ў беларускіх абставінах заклікалі пад выглядам агітацыі ісьці галасаваць па правілах рэжымнай машыны ўлады, ў рэальнасьці спрыялі рэжыму ў дасягненьні патрэбных яму вынікаў.

2001, 2004, 2006 гады наглядна паказалі, што нельга больш удзельнічаць у выбарах пры антыбеларускім, антыпраўным рэжыме. Гэта ніякія ня выбары. Няма выбараў пад дыктатурай. Удзел людзей у галасаваньні рэжым скарыстоўвае ў сваіх інтарэсах.

Неабходна рыхтавацца да грамадзянскага змаганьня. У дзень галасаваньня трэба ісьці не на выбарчыя ўчасткі галасаваць, а выходзіць на вуліцы і плошчы, сьведчыць пра няўдзел увыбарах, яднацца ў пратэстах і дзеяньнях. Тады выявяцца і будуць сапраўдныя беларускія змагары і сапраўдныя беларускія арганізатары.

***Сойм Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі – БНФ***
***і Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне”***
*13 жніўня 2006 г. г. Менск*

# АДНАЎЛЕНЬНЕ НЕЗАЛЕЖНАСЬЦІ Ў ЖНІЎНІ 91-ГА: ХРОНІКА ПАДЗЕЯЎ

**25 жніўня 1991 года была адноўленая незалежнасьць Беларусі. Гэтаму папярэднічалі драматычныя падзеі, зьвязаныя са спробай перавароту ў Маскве і падтрымкай путчыстаў („ГКЧП”) большай часткай кіраўніцтва Вярхоўнага Савета Беларусі.**

Яшчэ раніцай 19 жніўня 1991 году дэпутаты Апазыцыі БНФ і „дэмклюбу” у Вярхоўным Савеце 12 скліканьня выступілі з асуджэньнем перавароту; у той жа дзень перад Домам ураду быў праведзены мітынг. Сотні людзей зьбіраліся на плошчы таксама 20 і 21 жніўня. Людзі, якія прыходзілі на плошчу, рызыкавалі свабодай : пазьней стала вядома пра адмысловыя закратаваныя вагоны, падагнаныя на чыгуначны вакзал. Шмат якія працоўныя калектывы прымалі рэзалюцыі з асуджэньнем ГКЧП. Дэпутаты (у тым ліку і першы намесьнік Старшыні ВС Станіслаў Шушкевіч) запатрабавалі ад старшыні ВС Мікалая Дземянцея тэрмінова склікаць сэсію парляманту, аднак ён выступіў на баку путчыстаў.

Пасьля паразы ГКЧП Прэзыдыюм ВС быў вымушаны прызначыць сэсію.

24 жніўня дэпутаты сабраліся ў Авальнай залі Дома ўраду. Але Прэзыдыюм у парадак дня плянаваў уключыць толькі два пытаньні – „Аб бягучым моманце” і „Аб Саюзным дагаворы” і завяршыць сэсію ў той жа дзень. Аднак старшыня Апазыцыі БНФ Зянон Пазьняк прадставіў пакет заканадаўчых прапаноў, у тым ліку – і аб наданьні Дэкларацыі аб сувэрэнітэце статусу канстытуцыйнай сілы. Парляманцкая большасьць была вымушаная ўключыць іх у павестку дня.

Дэпутаты БНФ скарысталіся тым, што ішла непасрэдная тэле– і радыётрансьляцыя, і заклікалі менчукоў далучыцца да актывістаў Народнага Фронту, якія ўжо стаялі на плошчы перад Домам ураду. Неўзабаве там сабраліся некалькі дзесяткаў тысяч чалавек.

Першы сакратар ЦК кампартыі Анатоль Малафееў спрабаваў апраўдаць дзеяньні кампартыі, але быў сагнаны з трыбуны дэмакратычнымі дэпутатамі. Дзейнасьць КПБ-КПСС і камсамола на тэрыторыі Беларусі была прыпыненая.

Мікалай Дземянцей быў вымушаны падаць у адстаўку (пазьней у сваіх мэмуарах ён напіша, што ніколі не паставіў бы подпіс пад Віскулёўскімі пагадненьнямі аб дэнансацыі СССР).

25 жніўня абмяркоўвалася прапанова Апазыцыі БНФ аб наданьні Дэкларацыі аб дзяржаўным сувэрэнітэце статусу канстытуцыйнай сілы.

Шмат хто з дэпутатаў гэтую ідэю ўспрыняў нэгатыўна. Так, дэпутат Аляксандар Лукашэнка выступіў супраць, заявіўшы, што Беларусь апынецца ў ізаляцыі ад Расеі, „на задворках формирования новых органов управления Союза” і прапанаваў не „мусировать” пытаньне сувэрэнітэту.

Для прыняцьця рашэньня патрэбныя былі дзьве трэціны галасоў дэпутатаў, – Станіслаў Шушкевіч, які вёў паседжаньне, выказаў сумнеў, што рашэньне будзе прынята.

Пераломную ролю адыграў выступ Зянона Пазьняка, які прааналізаваў сытуацыю ў Расеі і прапанаваў наменклятуры, якая баялася Ельцына, распачаць пабудову незалежнай ад Масквы дзяржавы: „…з усёю адказнасьцю магу сказаць, што на Усходзе ў нас фармуецца маладая агрэсіўная імпэрыя ў форме дэмакратыі. Тыя дэмакраты, якіх мы добра ведаем, не прызнаюць фактычна нас як нацыю, яны не глядзяць на нас, як на асобную дзяржаву і на асобную тэрыторыю, а глядзяць на нас, як на вотчыну, на якую яны маюць пэўнае права. На вялікі жаль, гэта так. І менавіта зыходзячы з гэтых меркаваньняў я неаднойчы выказваўся і пісаў аб тым, што я сумняваюся ў дэмакратычным характары будучай Расіі…. Ельцын паведаміў аб тым, што зьбіраецца павысіць цэны на нафту. Гэта быў у пэўнай ступені шантаж нашай рэспублікі. І ён быў не першы раз. Калі мы не будзем мець дзяржаўнай незалежнасьці, ня зможам свае рэсурсы, свае ўсе сродкі, свае вынікі працы ўкладваць на дабро нашага народа і нашай дзяржавы, мы не зможам супрацьстаяць гэтай палітыцы… Я прашу вас паставіць гэтае пытаньне і вырашыць яго сёньня. Бо заўтра можа быць позна”.

Адразу пасьля выступу лідэра БНФ слова ўзялі сакратары абкамаў і райкамаў партыі (цяпер ужо былыя), якія заклікалі прыслухацца да аргумэнтаў Пазьняка. З падтрымкай выступіў і старшыня Савету міністраў Вячаслаў Кебіч.



(Фота: з кнігі С. Навумчыка „Сем гадоў адраджэньня”...)

*Першая ноч незалежнасьці перад Вярхоўным Саветам.*

У Авальнай залі прысутнічала 265 дэпутатаў, для станоўчага рашэньня патрабавалася 232 галасы. За наданьне Дэкларацыі аб сувэрэнітэце прагаласавалі 252 дэпутаты. У 20 гадзін 08 хвілін Беларусь вярнула незалежнасьць. (Дарэчы, дэпутат Лукашэнка ў галасаваньнях па ключавых пытаньнях ўдзелу ня браў, у стэнаграме насупраць ягонага прозьвішча пазначана – „адсутнічаў”).

Гэтае рашэньне Вярхоўнага Савета віталі тысячы людзей на плошчы перад Домам ўраду, якая пазьней была названая ў гонар незалежнасьці.

***Сяргей Навумчык***

# З. ПАЗЬНЯК: «МЫ ПАВІННЫ ГЭТЫ СЬЦЯГ І ГЭРБ БЕРАГЧЫ ЯК СЬВЯТОЕ»

15 гадоў таму (19-га верасьня 1991г.) Бел-чырвона-белы сьцяг і „Пагоня” сталі дзяржаўнымі сымваламі. У верасьні 1991 году, празь некалькі дзён пась-

ля правалу маскоўскага путчу і наданьня на пазачарговай сэсіі Вярхоўнага Савету „Дэклярацыі аб сувэрэнітэце" статусу канстытуцыйнага закону, на патрабаваньне дэпутатаў Апазыцыі БНФ была скліканая яшчэ адна сэсія. У парадак дня было ўключана і пытаньне аб назове краіны і дзяржаўных сымвалах.

Аднак настроі большасьці дэпутатаў у сярэдзіне верасьня істотна розьніліся ад жнівеньскіх, „пасьляпутчаўскіх". Дзейнасьць КПБ-КПСС была прыпыненая, але ва ўрадавых кабінэтах заставаліся тыя ж самыя чыноўнікі, якія былі прызначаныя партыяй. Вячаслаў Кебіч, які ў грамадзкай сьвядомасьці ўвасабляў намэнклятуру, заявіў пра намер заняць пасаду старшыні Вярхоўнага Савету (у верасьні 1991-га ён саступіць толькі некалькі галасоў Станіславу Шушкевічу).

Калі 25 жніўня 1991 г. канстытуцыйнасьць „Дэклярацыі аб сувэрэнітэце" набрала дзьве траціны галасоў, дык праз тры тыдні атрымаць галасы паловы дэпутатаў, неабходных для прыняцьця дзяржаўнай сымволікі, выглядала праблематычна.

Акрамя таго, трэба было тэрмінова зрабіць эталён дзяржаўных сьцяга і гэрбу (як вядома, у розных крыніцах існавалі розныя (у дэталях) выявы „Пагоні"). На просьбу Зянона Пазьняка, групу мастакоў узначаліў Яўген Кулік, яму дапамагалі Мікола Купава, Лявон Бартлаў, Уладзімер Крукоўскі і інш. Эталён гэрбу і сьцягу імі быў створаны.

У Доме ўраду, у фае перад Авальнай заляй была зроблена выстава, прысьвечаная гісторыі Бел-чырвона-белага сьцягу і „Пагоні". Дэпутаты Апазыцыі БНФ у прыватных гутарках тлумачылі калегам па парлямэнце эпізоды беларускай гісторыі; некаторыя дэпутаты-ветэраны толькі ў тыя дні ўпершыню пачулі пра Грунвальд.

19 верасьня, калі падышоў час абмеркаваньня і галасаваньня, па настроях значнай часткі дэпутатаў зрабілася відавочна, што рашэньне можа і не прайсьці. Тады Зянон Пазьняк патэлефанаваў акадэміку-матэматыку Уладзімеру Платонаву, папрасіў яго тэрмінова прыехаць і зачытаць афіцыйнае заключэньне навукоўцаў-гісторыкаў. Для „намэнклятурных" дэпутатаў пасада Платонава – прэзыдэнт Акадэміі Навук – мела аўтарытэт. Яшчэ большы аўтарытэт у намэнклятуры меў Георгій Таразевіч – былы Старшыня Прэзыдыюму ВС БССР, а ў той момант – старшыня камісіі і член Прэзыдыюму ВС СССР, якога таксама папрасілі выступіць у падтрымку нацыянальных сымвалаў.

Прыгадвае Старшыня Апазыцыі БНФ у ВС 12-га скліканьня Зянон Пазьняк:

(Пазьняк: ) „...Ужо апошняе галасаваньне, і зноў не набярэм адзін-два галасы. І гэта ўжо будзе канец. І тады я падышоў да аднаго намэнклятурнага камуніста, нашага ворага, я бачыў, што ён галасаваў „супраць". Узяў яго за руку і, гледзячы ў вочы, сказаў: „Я Вас вельмі прашу, прагаласуйце за Сьцяг, дзеля нашай будучыні. Мы ж – беларусы!". Ён быў ашаломлены. Але гэта быў прыстойны чалавек, і ён сказаў: „Добра. Я прагаласую". І прагаласаваў. Трэба было набраць 231 голас. І калі на табло зьявілася лічба 231, я на імгненьне страціў прытомнасьць. Я проста ўпаў на стол галавой...

Павінен сказаць, што за ўсё жыцьцё, у цяжкіх фізычных і маральных абставінах, я ніколі не губляў прытомнасьці, ніколі не „адключаўся". Прыняцьце сьцягу нагэтулькі было цяжкім, нагэтулькі вымучыла усіх нас, „фронтаўцаў", у Вярхоўным Савеце, і нагэтулькі вісела на валаску, што калі сьцяг быў прыняты, я адключыўся на нейкі час.

Прыйшоў у сябе хутка, сэрца было ў вельмі дрэнным стане, трэба было адпачыць трохі, але мяне пацягнулі на плошчу. Там стаяла тысячы дзьве людзей, трэба было выступаць. І калі я прыйшоў на плошчу, я яшчэ не адышоў ад вобмараку, і ня мог выступаць. Я пачаў нешта лепятаць, і ў мяне пацяклі сьлёзы. Цякуць сьлёзы перад усімі, я думаю: „Ну ўсё, канец палітыку Пазьняку. Плача, як баба. Усё". І як ні дзіўна, гэтага ніхто не заўважыў. Проста ўсе жылі гэтай падзеяй. Плакалі многія, гэта здавалася натуральным, і многія проста не заўважылі майго стану. Вось як запомнілася мне псыхалягічна гэта ўсё".

У той жа дзень, 19 верасьня 1991 г., быў зьменены назоў краіны – замест Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі яна стала называцца Рэспубліка Беларусь.

Вясной 1995 года прэзыдэнт Аляксандар Лукашэнка выступіў зь ініцыятывай правядзеньня рэфэрэндуму, які прадугледжваў, сярод іншага, скасаваньне Бел-чырвона-белага сьцягу і „Пагоні" як дзяржаўных сымвалаў і наданьне расейскай мове роўнага статусу зь беларускай. Праект „новай" сымволікі распрацоўваў кіраўнік прэзыдэнцкай адміністрацыі Леанід Сініцын. Дэпутаты Апазыцыі БНФ заявілі пра неканстытуцыйнасьць рэфэрэндуму і на знак пратэсту абвясьцілі галадоўку, але былі зьбітыя ў залі парлямэнту батальёнам спэцпадразьдзяленьня КДБ „Альфа".

Адразу пасьля рэфэрэндуму (травень 1995 г.) кіраўнік справаў адміністрацыі прэзыдэнта Іван Ціцянкоў узьняўся на дах адміністрацыі і перад відэакамэрай разадраў Бел-чырвона-белае палотнішча на кавалкі, паставіўшы на іх свае аўтографы. Аднак прыкметна, што Вярхоўны Савет 12-га скліканьня так і не зацьвердзіў вынікі рэфэрэндуму – гэта зрабіў толькі Вярхоўны Савет 13-га скліканьня ў 1996 годзе.

Нагадаем, што падчас рэфэрэндуму назіральнікі зафіксавалі парушэньні „Закону аб народным галасаваньні (рэфэрэндуме)" – апанэнты ўлады не маглі данесьці альтэрнатыўную пазыцыю праз СМІ, на шмат якіх ўчастках зарэгістравалі фальсыфікацыі. На думку былога члена Канстытуцыйнага Суду, доктара юрыдычных навук, прафэсара Міхаіла Пастухова, „калі прызнаць, што пытаньні аб мове і замене сымволікі не маглі, паводле дзейнага заканадаўства, выносіцца на галасаваньне, тады «пераможныя» вынікі страчваюць сваю прававую сілу і ня цягнуць за сабою ніякіх прававых наступстваў. Іх папросту належыць забыць і аднавіць ранейшае становішча".

(Пазьняк: ) „Нацыянальны дзяржаўны сьцяг і гэрб – гэта сымвалы дзяржавы і нацыі. Але ня толькі сымвалы. Сьцяг і гэрб ёсьць эквівалентам дзяржавы і эквівалентам нацыі. Прытым рэальным эквівалентам, так як, скажам, грошы ёсьць эквівалент пэўнай затрачанай працы. Калі ёсьць дзяржава, дык ёсьць і сьцяг. А калі няма сьцяга – дык нават карабля на моры ня будзеш мець, прыйдзецца хадзіць пад чужым сьцягам. Таму сьцяг – гэта найважнейшая каштоўнасьць, якая сьцьвярджаецца ў першую чаргу. Як толькі сьцьвярджаецца нацыянальная дзяржава, тут жа прымаецца нацыянальны сьцяг. Гэта – мэта ўсёй нацыі. Які сьцяг – такая і дзяржава.

Мы маем цяпер фальшывы сьцяг, мы маем цяпер фальшывы рэжым. Гэта карэлюецца, і гэта зьвязана. Таму барацьба за сьяг – гэта ёсьць барацьба за свабоду, за нацыю, за будучыню. Гэта ёсьць, паўтараю, найважнейшая каштоўнасьць у дзяржаўным будаўніцтве. Тры ёсьць важныя для нас каштоўнасьці – для ўсіх нас, аб'ектыўна, незалежна ад палітычных разыходжаньняў. Гэта наша дзяржава незалежная, гэта наша мова беларуская, і гэта наш Бел-чырвона-белы сьцяг і наш гэрб „Пагоня".

Вось гэтыя сымбалі і каштоўнасьці для нас ёсьць найважнейшыя. Яны прарастаюць з глыбіні, з глыбіні нашага Вялікага Княства Літоўскага, іх ніхто не прыдумаў, ніякі дыктатар. Іх прыдумаў наш народ, наша культура, на іх кроў нашых продкаў. І таму мы павінны гэты сьцяг берагчы як сьвятое. Ён дапаможа нам вярнуцца да нашай велічы, да нашай вялікай Літвы".

***Сяргей Навумчык***
*(Радыё Свабода)*

# КАБ ПЕРАМАГЧЫ АНТЫБЕЛАРУСКІ РЭЖЫМ, ТРЭБА СТВАРЫЦЬ БЕЛАРУСКУЮ НАЦЫЯНАЛЬНУЮ СІЛУ

*Апошнім часам пачасьціліся лісты маладых беларусаў, якія хочуць даведацца, што сталася з Народным Фронтам, чаму раскалоўся, чаму змалела ягоная сіла і палітычныя ўплывы. Шмат каго бянтэжыць рэзкая крытыка з нашага боку цяперашняй „кааліцыйнай апазыцыі" і крытычныя ацэнкі дзеяньняў яе ўдзельнікаў і асобаў. Вось тыповыя пытаньні:*

***„Я вельмі прашу Вас патлумачыць, чаму Вы ўважаеце Партыю БНФ за прарасейскую апазыцыю?"***

***„У маёй галаве не ўкладаецца, што сп. Вінцук здольны сьвядома выкарыстоўваць нас усіх улучна зь ягоным сынам дзеля дасягненьня прарасейскіх мэтаў."(Юрась Віцьбіч)***


(Фота: Фота П. Батуева)

*Менск, 2005 г. Беларускія сьцягі над Сьвіслаччу.*

*Пастараюся адказаць коратка пра галоўнае, бо на гэту тэму і мной, і сябрамі Фронту ўжо дастаткова шмат напісана ў адраджэнскім друку. Праўда, ўлічваю абставіны, што ня кожнаму гэты друк даступны.*

* * *

Ніхто не сумняваецца, што В. Вячорка за Беларусь, за незалежнасьць, мову і г.д. і ніхто ня лічыць яго „прарасейскім", „агентам" і т. п. Толькі для палітычнай дзейнасьці гэтага недастаткова. Трэба памятаць, што палітыка мае свае законы і правілы і калі іх ігнараваць, то добрымі пажаданьнямі можна вымасьціць дарогу ў пекла.

Адколатая частка фронтаўцаў, змагаючыся супраць Лукашэнкі, спакусілася на заходнюю фінансавую падтрымку ( і, адпаведна, прыняла заходнія умовы), пайшла на хаўрус з прамаскоўскімі партыямі і нават з камуністамі, думаючы, магчыма, пашырыць на іх свой нацыянальны уплыў. Але яны не ўсьвядомілі, што праз чужыя грошы паддаліся чужой палітыцы. У выніку прамаскоўскія партыі здамінавалі так званую апазыцыю, а фронтаўцы зь Вячоркам апынуліся на трэціх ролях; верхаводзяць Калякін, Лябедзька, Бухвостаў, усюды гавораць і пішуць па-руску, езьдзяць у Маскву да Караганава ды Маркава ды Нямцова, выбіваюць прыхільнасьць і сродкі, улягаюць небеларускай палітыцы, і Вячорка ў гэтай кампаніі як сьведамы шэраговец. Адпрацоўвае датацыі.

Усё гэта абазначае паўзучую паразу беларускай нацыянальнай ідэі (ідэі, на якой трымаецца нацыянальная дзяржава і нацыя). У гэтым і сутнасьць здрады. Не сталі змагацца за беларускую справу, як нашыя адраджэнцы дзяды-прадзяды, як Народны Фронт супраць камунізму, СССР ды КПСС, а паддаліся хаўрусьнікам дзеля хаўрусу, дзеля абяцаных прагматычных інтарэсаў, ахвяраваліся вялікім дзеля малога.

У выніку на сёньняшні дзень Беларусь, фактычна, апынулася без нацыянальнай палітычнай альтэрнатывы. Калі цяпер ці ў недалёкім часе пры такіх варунках адбываецца перамена рэжыму, то да ўлады ў Беларусі (пры дапамозе Масквы, калякіных і лябедзек) прыходзяць зноў антыбеларускія сілы (цяпер ужо пад выглядам „дэмакратаў"). Дзесяць гадоў таму, калі ў беларускай апазыцыі і палітыцы дамінаваў Беларускі Народны Фронт „Адраджэньне", такога ніколі б ня здарылася. У Беларусі тады была нацыянальная палітычная будучыня. Цяпер нацыянальна-дэмакратычныя адраджэнскія сілы аслабленыя.

Пра ўсё гэта я казаў, пісаў і папярэджваў і сем, і восем, і дзесяць гадоў таму. Гарантыя палітычнай перамогі не ў фармаваньні кааліцыяў з апанэнтамі дзеля дасягненьня блізкіх мэтаў, а ў стварэньні моцнай палітычнай беларускай сілы, якая будзе грунтам стратэгічных дасягненьняў нацыянальнай палітыкі. Ніхто ня можа сказаць, што нічога ня ведаў і ня чуў, калі паўстане пытаньне аб адказнасьці. Ёсьць канкрэтныя вінавайцы. Цяперашняя задача ўсёй нашай беларускай супольнасьці – вярнуць Беларусі нацыянальную палітычную пэрспэктыву, каб мець будучыню.

***Зянон ПАЗЬНЯК***

*15 жніўня 2006 г.*

# СЬВЯТАЯ ВОРША

Зьнішчэньне гістарычнай памяці беларускай нацыі – адна з прыярытэтных задачаў расейскага імпэрыялізму, які выкарыстоўвае ў сваёй антыбеларускай вайне перш за ўсё мясцовы шклоўска-прамаскоўскі рэжым марыянэтак. Аднак, трэба прызнаць, што фальшывая карціна нашай гісторыі створана вельмі даўно, яшчэ за царамі. Палатно, намаляванае цьмянымі фарбамі, даўно зашмальцавалася і парэпалася. Але крамлёўскія рэстаўратары-фальсіфікатары з упартасьцю працягваюць яго паднаўляць. Савецкая школа рэстаўрацыі падмазала некаторыя месцы чырвоным, цяперашнія спэцы ад „дэмакратычнага Крамля" увіхаюцца каля свайго артэфакта з палітрай у тры колеры. На палатне ёсьць розныя сюжэты пра „вечную дружбу братніх народаў", пра цароў і генсекаў-вызваліцеляў. Ёсьць нават „В.І. Ленін на менскім вакзале" (гэта – адзін з нямногіх праўдзівых эпізодаў; едучы ў эміграцыю ў 1905 г., Уладзімір Ільіч купляў на нашым вакзале піражкі). Ёсьць усё, акрамя гістарычнай праўды. Карціна вечна вісіць перад вачыма ў беларускіх дзяцей, беларускай моладзі. Цэлыя пакаленьні нашых людзей выгадаваны на фальшывым акупанцкім „шэдэўры", які ёсьць адным з важнейшых наглядных сродкаў зьнішчальнай русіфікацыі беларускага народу.

Вайсковую славу нашых продкаў акупанцкія рэжымы яшчэ з 1918 года нахабна падмянілі прыдуманай Сталіным агульнарэспубліканскай п'янкай на „день советской армії". Вядома, што нават кітайцы ўжо пацiху пачалі разьвітвацца з Мао. Але цяперашнія крамлёўцы-лубянцы штогод працягваюць арганізаванае „ваенна-патрыятычнае" пакланеньне Бахусу 23 лютага. Што ж адбылося ў той дзень у 1918 годзе? Пагартаем мэмуары нямецкага генэрала Каўфмана, камандуючага Усходнім фронтам: „Такой вайны мы яшчэ ня бачылі. Мы ставілі на чыгуначную плятформу гармату, прычаплялі да яе яшчэ два-тры вагоны з пехацінцамі і ехалі ўперад. На чарговай станцыі нашы жаўнеры арыштоўвалі ўсіх бальшавікоў і ехалі далей..." На Беларусі 23 лютага 1918 г. кайзэраўскія немцы занялі Менск, зь якога ўжо паўцякалі ўсе бальшавікі. Але сталінская фальшыўка працягвае ачмураць п'яным чадам мільёны людзей на працягу скора як дзевяноста гадоў. Такое й Мао ня сьнілася.

Чаму ўсё так, нягледзячы на распад бальшавіцкай імпэрыі, на даўняе „асуджэньне культу асобы" і новыя рэдакцыі падручнікаў? Чаму мясцовыя марыянэткі і іхнія крамлёўскія гаспадары так учэпіста, так сутаргава трымаюцца за хлусьню? Чаму яны так баяцца гістарычнай праўды, велічнай і гераічнай Гісторыі беларускага народу?

Іхны страх панічны і люты. Яны ведаюць, што калі народ вылечваецца ад амнэзіі і вяртае сабе сваю праўдзівую мінуўшчыну, то ён ніколі і ні ў чым не дазволіць падманваць сябе. Пад яркім сонцам праўды растварыцца, зьнікне марыянэткавая цвіль, што апанавала Беларусь і не дае нармальна жыць і разьвівацца нашаму народу.

8 верасьня, як заўсёды, менскі афіцыёз маўчыць пра Дзень Беларускай Вайсковай Славы. На Крапіўным поле пад Крыжом у памяць беларускіх герояў-пераможцаў зьбіраецца наша модазь. Лунаюць нацыянальныя Бел-Чырвона-Белыя Сьцягі, гучаць даўнія і цяперашнія песьні аб нашай Гісторыі. Авангард грамадзтва сьвяткуе чарговую гадавіну велічнай перамогі 1514 года. Наш народ ніколі не забудзе сваю славу, пакуль маладыя будуць вяртацца на Крапіўнае поле і сьпяваць аб перамозе над маскоўскім агрэсарам.

Кожны народ, кожная краіна захоўваюць як сьвятыню памяць аб слаўных бітвах, у якіх вырашыўся іхны лёс, вызначыўся шлях іхнага існаваньня. На прыкладзе самаахвярнасьці, баявога майстэрства і мужнасьці продкаў угрунтоўваецца духоўны стан цяперашняга нацыянальнага грамадзтва. Імя перамогі набывае з гадамі магічны сэнс, надае сілу і ўпэўненасьць, гуртуе людзей у нацыю.

Узброенае сутыкненьне, імя якога залатымі літарамі сьвеціцца з далечыні стагоддзяў, не заўсёды вызначаецца вялікімі маштабамі, лічбамі ўдзельнікаў і стратаў. У 480 г. да н.э. у Фэрмапільскай цясьніне на шляху мільённага пэрсідскага войска сталі трыста спартанцаў з царом Леанідам, каб не пусьціць ворагаў у Эладу. На працягу некалькіх дзён купка ваяроў

адбівала атакі чужынскай цемры. Усе героі загінулі, але іхны подзьвіг абудзіў грэкаў, натхніў іх на змаганьне і перамогу. Прамінулі тысячагоддзі, але сёньняшнія грэкі і людзі з усяго сьвету ўспамінаюць пра даўніх ваяроў, чытаючы эпітафію на фэрмапільскім помніку: „Падарожнік, перадай у Спарту – верныя нашым законам, мы тут палеглі ўсе”.

У параўнаньні з Марэнга, Аўстэрліцам, Ваграмам, Лейпцыгам і іншымі вялікімі бітвамі напалеёнаўскіх войнаў бітва пры Вальмі (1792 г.) ня ўражвае шырынёй батальнай панарамы. З абодвух бакоў у той дзень загінула каля 500 вайскоўцаў (пры Ватэрлоо былі дзесяткі тысячаў стратаў). Але Вальмі была першай перамогай французкай рэвалюцыйнай арміі. Пасьля шэрагу месяцаў паразаў, адступленьня, здрады, панікі і ўцёкаў пад ударамі прафэсійнай прускай арміі французкія палкі дабраахвотнікаў урэшце разграмілі фэадальную рэакцыю. Упершыню арыстакраты і халопы ў белых мундзірах пабеглі ад паспалітага рушэньня, ад тысячаў людзей, згуртаваных пад сьцягам Свабоды. Перамога пад бэльгійская вёсачкай Вальмі сталася ключом да антыфэадальнай рэвалюцыі па ўсёй Эўропе.

Часьцей за ўсё сучасьнікі падзеяў ня бачылі і не разумелі ключавога значэньня лакальнай перамогі. Толькі далейшае разьвіцьцё падзеяў вызначала новую гістарычную тэндэнцыю. На працягу Стогадовай вайны Францыя цярпела адну за адной паразы ад ангельскіх агрэсараў. Парыж быў у руках захопнікаў, нацыя назаўсёды павінна была стацца прыгонным ангельскіх гаспадароў. Але побач са слабым і нерашучым каралём зьявілася Жана Д’Арк, сялянская дзяўчына, натхнёная Верай. Яна здолела пераканаць эліту і народ у неабходнасьці барацьбы. Разгром акупантаў і вызваленьне ад аблогі горада Арлеана ў 1429 г. былі першым трыюмфам французкага войска за доўгія дзесяцігоддзі канфлікту. На працягу лічаных месяцаў у некалькіх вырашальных бітвах французы пад кіраўніцтвам Жаны здолелі пераламіць ход вайны і распачалі канчатковае вызваленьне сваёй краіны.

Перамога надзвычай важная, калі народу і кіраўніцтву ўжо здаецца, што вайна прайграна, калі вораг брутальна стукаецца ў браму сталіцы. На самым пачатку Першай сусьветнай вайны немцы магутным ударам праврвалі бэльгійскую і французкую абарону і ішлі маршам на Парыж. На некаторых участках у верасьні 1914 г. французы ўжо ня мелі чым закрываць пустату на абарончай лініі па рацэ Марне. У Бэрліне рыхтаваліся да сьвяткаваньня сваёй перамогі. Але Парыж выратавалі гарадзкія таксісты. На сваіх машынах яны тэрмінова даставілі на Марну шэсьць тысячаў жаўнераў і афіцэраў, якія сарвалі плян кайзэраўскага бліц-крыгу. А Рым, як памятаем, аднойчы выратавалі гусі. Птушкі сваім крыкам абудзілі ахову на мурах Капітолія, і тая адбіла начны штурм галаў.

У гісторыі Эўропы ёсьць бітвы, якія сталі лёсавызначальнымі для ўсяго нашага кантынэнта, для Хрысьціянства, эўрапейскай культуры і тоеснасьці. Перамога хаўруснага флёту Каталіцкай Лігі над асманамі 5 кастрычніка 1571 г. пры Лепанта паклала крэс турэцкай экспансіі на моры. Вось як апісвае той дзень італьянскі гісторык Джані Грандзота ў сваёй кнізе „Бітва пры Лепанта”: „Узьняліся баявыя сьцягі. Над каралеўскім фрэгатам лунаў вялікі сьцяг Лігі з містычнай выявай Збаўцы нашага на крыжы. Палотнішча з крэмізінавага шоўку. Як толькі ён стаў бачны на самай высокай мачце, усе ваяры флёту ад галоўнакамандуючага да апошняга жаўнера зьнялі з галоваў свае шлемы і каскі ды ўкленчылі на палубах. Княскія і нацыянальныя сьцягі былі спушчаны. Застаўся толькі сымвал Збаўцы ды блакітныя, зялёныя і жоўтыя вымпелы на насах галераў дзеля адрозьніваньня эскадраў.” Перамога Крыжа над усходнімі захопнікамі пры Лепанта дагэтуль служыць прыкладам эўрапейскай салідарнасьці ў абароне хрысьціянскай цывілізацыі. Які выразны кантраст з цяперашчынай, калі безбожнікі-сацыялісты без бітваў і аблогаў дапусьцілі ў Эўропу мільёны агрэсіўных чужынцаў.

Дзіўнай прыхамацьцю лёсу ў некаторых народаў і імпэрыяў у якасьці гістарычнага ідэалу служаць сакрушальныя паразы. Напрыклад, разгром сэрбскага войска туркамі на Косавым полі ў 1386 г. На апяваньні гэтай трагедыі грунтуецца белградская імпэрская філясофія нават на пачатку 21-га стагоддзя. На ўсход ад Беларусі „полем русской славы” называецца ўчастак непадалёк ад Масквы. У 1812 г. каля вёсак Барадзіно і Шэвардзіно шматнацыянальная армія Напалеёна (там былі і беларускія палкі) разграміла расейскую армію і на наступны дзень заняла варожую сталіцу. „Творчае пераўтварэньне” паразы ў перамогу пачалося адразу ж пасьля бітвы. Напярэдадні прыбыцьця ў Таруцінскі лягер французкага пасланца Лярыстона Кутузаў аддаў войскам адмысловы загад: „водки не жалеть, петь и веселиться...” Напалеёнаўскую дэлегацыю ўразілі тысячы пашкуматаных жаўнераў, якія пад гармонікі апантана танцавалі і сьпявалі каля вогнішчаў. Зьдзіўленыя французы пачалі гаварыць пра мір. (А вось партайгэносэ Гэбельс усё б зразумеў і высока ацаніў бы ініцыятыву крамлёўскіх таварышаў).

Ёсьць яшчэ адзін вельмі важны аспэкт тэмы: выкарыстаньне даўніх бітваў у практычных і ідэялягічных мэтах. Што да практыкі, то тут вызначыліся генэралы Гітлера. Справа ў тым, што немцы вельмі ганарыліся сваім грунвальдскім „рэваншам”. У жніўні 1914 г. ім удалося разграміць расейскую армію генэрала Самсонава на тых самых палях, дзе ў 1410 г. войска Кароны і ВКЛ разьбіла немцаў пры Грунвальдзе і Танэнбэргу. Канцэнтруючы вялікія масы войскаў перад нападам на Польшчу на прыканцы жніўня 1939 г., гітлераўцы тлумачыліся сьвяточнымі мерапрыемствамі і парадам з нагоды 25-й гадавіны перамогі над расейцамі пад Танэнбэргам (які знаходзіўся тады ў нямецкай Усходняй Прусіі непадалёк ад польскай мяжы). І палякі паверылі ім!

Ідэалягічнае выкарыстаньне славутых імёнаў перамогі антынароднымі рэжымамі, якія самы сабой уяўляюць пэрманэнтную нацыянальную паразу, працягваецца дагэтуль. Успомнім у гэтай сувязі вэнэсуэльскага дэмагога Уга Чавэса. Мітусьлівы і крыклівы левак-мільянэр сваімі паводзінамі больш нагадвае піянэра з барабанам. Але сярод іншых ягоных хэпэнінгаў адным з галоўных зьяўляецца раздача направа і налева нацыянальнага ордэна Карабоба. Імя найвялікшай перамогі Лацінаамэрыканскай рэвалюцыі пачатку 19-га стагоддзя пад кіраўніцтвам Сымона Балівара над гішпанскімі каляніялістамі зрабілася разьменнай манэтай у нячыстых руках прыгнятальнікаў народу.

У адрозьненьні ад вэнэсуэльскіх калегаў шклоўскі рэжым, як вядома, інакш рэагуе на беларускую гісторыю. З Масквы даўно паступіў нэакаляніялісцкі загад – „не пушчать!..” І марыянэткі кінулі цемру „спэцоў” на абалваньваньне нашага народу „історіей Белоруссіи с 1917 года”. Спаленыя і скалечаныя вычварэнскай „рэдакцыяй” падручнікі, на паліцы кнігарняў выкінуты горы фальсіфікатарскіх манаграфіяў пра „Белоруссію, которой не было до советской власті” і пра „фармаваньне беларускай нацыі з 1795 г.” (гэта значыць: як толькі захапілі маскоўцы, то і фармаваньне пачалося). Рэжым разбурае помнікі нашай мінуўшчыны і ставіць манумэнты зьнішчальнікам і акупантам Беларусі. Пераможны Бел-Чырвона-Белы Сьцяг Грунвальду і Воршы забаронены і абвешчаны рэжымам „фашыстоўскім”. У сучаснай гісторыі цяжка (бадай нават немагчыма) знайсьці ў цэлым сьвеце падобны прыклад страху дыктатуры перад гісторыяй уласнай дзяржавы. У гэтым панічным страху раскрываецца чужая сутнасьць акупанцкага прамаскоўскага рэжыму, што дагнівае на нашай зямлі.

Ворагі Беларусі баяцца сьвятых ценяў пераможцаў Воршы. Праз пяць стагоддзяў пасьля маскоўскай паразы на Крапіўным полі Крэмль зноў спрабуе паняволіць наш народ. Гэтым разам плян імпэрыі падступны і „мірны”. Нам хочуць падсунуць „фількіну грамату” пад псэўдавыбары-рэфэрэндум з цяперашнім назовам – „канстытуцыйны акт аб інтэграцыі з Расеяй”. І тым самым легалізаваць акупацыю, хватка падмануўшы беларусаў, як у 1652 г. падманулі „Пераяслаўскай радай” украінцаў.

Але ня выйдзе. Траянскім канём, якога коцяць па Беларусі крамлёўцылубянцы з дапамогай прамаскоўскай псэўдаапазыцыі (усіх гэтых мілінкевічаў-калякіных з вінцучкамі-лебедько), ня ўдасца надурыць авангард нашага грамадзтва – беларускую моладзь. Маладыя выразна заявілі сёлета ў сакавіку на плошчы Кастуся Каліноўскага: „Прэч з расейскай акупацыяй! Ня хочам русіфікацыі і сібірскага рабства! Жыве незалежная Беларусь!” Барацьба за Айчыну працягваецца. Настае рашучы этап змаганьня. Няхай жа Сьвятая Ворша будзе пуцяводнай зоркай беларускіх патрыётаў.

***Валеры Буйвал***

# НЕЗАЛЕЖНАСЬЦЬ
# І НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АСЬВЕТА

Нядаўна патрыёты на Бацькаўшчыне адзначалі 15-ю гадавіну аднаўленьня незалежнасьці Беларусі. Гэты дзень, 25-га Жніўня 1991 года, гэтак жа, як і 25 Сакавіка 1918-га, стаўся найвялікшай датай у гісторыі Беларусі XX-га стагоддзя. У жыцьці нацыі дасягненьне дзяржаўнай незалежнасьці ёсьць найвялікшай станоўчай падзеяй, якая вызначае лёс цэлых пакаленьняў. Такія зьявы ніколі не забываюцца. Наадварот, яны сакралізуюцца, робяцца сымваламі палітычных дасягненьняў і знакам пэўных ідэй.

Для нас, удзельнікаў гэтых падзеяў, 25 Жніўня сталася нашай бітвай пад Воршай. Скарыстаўшы правал камуністычнага путчу ў Маскве, жах і разгубленасьць савецкай намэнклятуры, нам удалося малымі сіламі выйграць вялікае змаганьне і перамагчы.

Пазьней мы аналізавалі, што калі б спазьніліся хоць бы на адзін дзень, вяртаньне назалежнасьці сталася б праблематычным. Ужо праз тыдзень, калі мінуў першы страх, антыбеларускія камуністычныя сілы, што складалі тады бальшыню ў парляманце, пачалі гаварыць аб скасаваньні вынікаў 25 Жніўня. Але было позна. Цягнік незалежнасьці ўжо рушыў, набіраючы ўсё больш і больш прыхільнікаў. Сілы на рэстаўрацыю старога камуністы ўжо не маглі сабраць.

Мушу адзначыць, што ўнікальная, з пункту гледжаньня лёгікі, перамога ў парляманце была ня толькі вынікам добрага ўзаемадзеяньня структураў Народнага Фронту і сьведчаньнем прадуманай дэпутацкай тактыкі. Незалежнасьць была падрыхтаваная ўсім ходам ідэёвай і палітычнай барацьбы Беларускага Народнага Фронту, які ў тыя часы яднаў усе адраджэнскія і антыкамуністычныя сілы ў Беларусі.

Ідэалёгія незалежнасьці была намі ўжо сістэмна распрацаваная да таго часу. Галоўным жа вынікам яе было прыняцьце Дэклярацыі аб сувэрэнітэце Беларусі яшчэ за год перад Незалежнасьцю.

Да гэтага часу намі быў падрыхтаваны ўжо шэраг незалежніцкіх законапраектаў, канцэпцыя эканамічных рэформаў, стратэгія рэсурснага забесьпячэньня (маецца на ўвазе Балта-Чарнаморскі калектар), прынцыпы пабудовы нацыянальнага Беларускага войска, нацыянальнай школы і сістэмы адукацыі, банкаўскай справы, увядзеньня нацыянальнай валюты, сістэма памежнай службы і г.д. Заставалася толькі ажыцьцявіць галоўнае і самае цяжкае – здабыць незалежнасьць.

На імгненьне магчымасьць такая зьявілася пасьля правалу камуністычнага путчу ў СССР. Гэтая магчымасьць была скарыстаная. На прыканцы стагоддзя шчасьце зноў усьміхнулася Беларусі.

Але паўстае пытаньне: чаму праз тры гады ўладу забралі прамаскоўскія сілы і незалежнасьць Беларусі і беларуская культура апынуліся пад пагрозай пэрманэнтнага зьнішчэньня?

Калі глянуць у корань, то прычына хаваецца ня толькі ў зьнешніх фактарах (пагроза Расеі), але, галоўным чынам, – ва ўнутраных, у самым беларускім грамадзтве, якое ў значнай сваёй частцы было тады яшчэ не падрыхтаванае для актыўнага ўспрыняцьця новых нацыянальных задачаў і да салідарнага змаганьня за свае нацыянальныя інтарэсы.

Пасьля выхаду з СССР і ліквідацыі КПСС грамадзкі ўздым зьнізіўся, людзі супакоіліся, вырашыўшы, што перамены ўжо адбыліся, і сталі чакаць вынікаў незалежнасьці.

Такія грамадзкія настроі, рэзкае зьніжэньне грамадзкай актыўнасьці пасьля нацыянальнай рэвалюцыі не паспрыялі дэмакратычным пераменам. Камуністычная намэнклятура захавала за сабой усю ўладу і неўзабаве трапіла пад жорсткі ўплыў Масквы. Значная частка беларускага грамадзтва заняла тады тыповую для беларуса пазыцыю назіраньня.

Незалежнасьць Беларусі была вернута сіламі нешматлікага яшчэ тады нацыянальнага авангарду пры падтрымцы актыўных людзей. Потым, калі трэба было вырашыць пытаньне ўлады і здабыць гэтую ўладу, авангарду не хапіла якраз шырокай грамадзкай апоры. Старая намэнклятура, якая да таго ж зьвярнулася па дапамогу ў Маскву, фактычна, рабіла, што хацела.

Гэта, а таксама пагаршэньне сацыяльных умоваў жыцьця і дзейнасьць КГБ, прывялі неўзабаве да ўлады ў Беларусі Лукашэнку і прамаскоўскія групы.

Якія высновы з гэтага ўсяго вынікаюць?

Новае Беларускае Адраджэньне, якое пачалося за часы СССР, фактычна, ня мела пэрыяду шырокага нацыянальнага асьветніцтва. Не хапіла ўжо часу. Падзеі пачалі разьвівацца вельмі хутка. І калі спатрэбілася нацыянальная падтрымка ад усяго грамадзтва, то яе якраз і не хапіла. Савецкім беларусам, у большасьці апрацаваным антыбеларускай сістэмай, трэба было тады яшчэ тлумачыць элемэнтарныя рэчы, напрыклад: навошта людзям свабода і нацыянальныя грошы, навошта мытня і межы і чаму неабходна шанаваць сваю беларускую мову.

На сёньняшні дзень сітуацыя ненашмат зьмянілася (асабліва ўлічваючы антыбеларускую прапаганду і прамаскоўскую палітыку рэжыму). Мы, беларусы, павінны сабе выразна ўсьвядоміць, што без нацыянальнай беларускай асьветы грамадзтва немагчымыя дэмакратычныя дасягненьні ў беларускай палітыцы. Гэта відавочная праўда. Неасьвечанае і дэнацыяналізаванае насельніцтва робіцца аб'ектам маніпуляцыяў і здольнае лёгка падлягаць прапагандысцкім уплывам і выступаць нават супраць сваіх нацыянальных інтарэсаў. Што, дарэчы, мы і назіраем у цяперашняй Беларусі.

Мы ўсе цяпер, у той час, калі ідзе шалёная русіфікацыя, павінны зьвярнуць вялікую ўвагу на нацыянальна-асьветніцкі бок справы. Гэта грунт, які ўмацуе нашую незалежнасьць і ўратуе культуру.

Вядома, найбольшае спадзяваньне будзе на людзей адукаваных, здольных пісаць і перадаваць інфармацыю. Але ўдзельнічаць у гэтай агульнанацыянальнай справе мусіў бы кожны беларус сваёю прыхільнасьцю, пазыцыяй і сродкамі, здольнасьцю адклікацца на паклічы і патрэбы беларускай асьветніцкай справы.

Нашая дзейнасьць і нашая беларуская актыўнасьць не павінны заміраць, а наадварот – пашырацца ва ўсім сьвеце.

Мушу адзначыць вельмі істотны момант. За апошнія 20 гадоў сьвет моцна перамяніўся. Вялікія хуткасьці, паветранны транспарт, міжнародныя эканамічныя дачыненьні і электронная сувязь (Інтэрнэт) фармальна зблізілі людзей, узрасла міграцыя і кантакты, фармуюцца новыя плянэтарныя дачыненьні.

У гэтых умовах функцыя дзяржаўнай мяжы як галоўнага чыньніка сувэрэнітэту пачынае зьніжацца, а функцыя нацыянальнай культуры, як новага чыньніка сувэрэнітэту, – павялічвацца. Адпаведна і ўзрастае роля нацыянальнай культуры (перш за ўсё, мовы) як дзейснага гаранта сувэрэнітэту краіны.

Сувэрэнітэт Беларусі ў плянэтарным і ў эўрапейскім сэнсе ў значнай ступені будзе залежыць ня толькі ад таго, што беларус назаве сябе беларусам, але і ад таго, што для яго, фігуральна кажучы, будзе бліжэй у ягоным культурным жыцьці і патрэбах, напрыклад, Янка Купала, Багдановіч, Быкаў, ці, скажам, Шылер, Шэкспір ды Талстой.

Нацыя, прадстаўнікі якой жывуць па-за нацыянальнай культурай і па-за нацыянальнай мовай (як галоўнага сродку культуры) – такая нацыя ў сучасным сьвеце страціць свой сувэрэнітэт.

Зьвернем увагу ў сувязі з гэтым на вельмі небясьпечную палітыку антыбеларускага рэжыму ў Беларусі па разбурэньні беларускай культуры.

І тым ня менш, ёсьць у нас порах у парахаўніцах!

Цяпер беларусы жывуць на ўсіх кантынентах. Мы робімся сусьветнай нацыяй. У нас ёсьць магчымасьці асьветніцкай працы і кансалідацыі. Калі мы напоўніцу скарыстаем гэтыя магчымасьці, то забясьпечым будучыню нашай культуры.

І тады ўжо нішто ня спыніць Беларусі! Беларусь была, ёсьць і будзе. Беларусь жыве і будзе жыць!

***Зянон ПАЗЬНЯК***

*3.09.2006 г.,*
*Нью Брансьвік*

# ПАКТ СУПРАЦЬ БЕЛАРУСІ

Вось „Парыж – Бэрлін – Масква" зноў плянуе свае дзеяньні. 23 верасьня ў Парыжы сабраліся Шырак, Пуцін і Мэркель. Гаспадар, а за ім і госьці ў сваіх прамовах пераконвалі эўрапейцаў, што яны „не ствараюць нейкі адмысловы хаўрус супраць іншых народаў, ня дзейнічаюць насуперак інтарэсаў трэціх краінаў". У чарговы раз дзьве галоўныя дзяржавы Эўразьвязу вадзілі карагод з крамлёўскім начальнікам. Ды ўсё на тую ж тэму: нафта і газ. Крамлёвец трымаўся ўпэўнена і лагодна запэўніваў, што „энэрганосьбіты будуць пастулаць на Захад". Шырак так узрадваўся, што павесіў на Пуціна ордэн Ганаровага Легіёна. Вышэйшы ордэн Францыі атрымаў арганізатар масавага забойства дзяцей у Беслане.

Французкае грамадзтва маўчыць. Хаця што там, у 1970-80-я гады тадышні прэзыдэнт Францыі Д'Эстэн публічна абдымаўся і прымаў ў падарунак брыльянты ад Бакасы. Гэты дыктатар з Цэнтральнай Афрыкі ня толькі кідаў палітычных апанэнтаў у басэйн з кракадзіламі і еў чалавечае мяса, але таксама пэрсанальна назіраў, як па ягоным загадзе жаўнеры на турэмным двары расстрэльвалі з кулямётаў школьнікаў, арыштаваных падчас дэманстрацыі пратэсту. Так што з лубянцам сапраўды можна спакойна ручкацца: ён есьць рэстаранную ежу, у Беслане ніколі ня быў, нічога ня бачыў, асабіста нікога не пакрыўдзіў.

Па выніках сустрэчы „трох галоўных эўрапейцаў" у Камп'ене пад Парыжам практычна нічога не вядома. Нам зразумела, аднак, што яны абмяркоўвалі таксама праблему з адной „транзітнай краінай" – а менавіта з нашай Беларусяй, якую яны плянуюць зьліквідаваць у наступным годзе агульнымі расейска-нямецка-францускімі намаганьнямі, каб забясьпечыць беспраблемную пастаўку нафты-газу з Сібіры, дзе павінны ўкалваць на рудніках і сьвідравінах беларускія рабы.

Успомнім, аднак, што аднойчы ўжо мястэчка Камп'ен было сьведкам сур'ёзнай паразы парыжскага эстэблішмэнту і раўнадушнага французкага грамадзтва, якія ў 1938 г. з лёгкасьцю аддалі Гітлеру тадышнія „транзітныя краіны" Чэхаславаччыну і Аўстрыю ды спадзяваліся на камфортнае існаваньне на чужой народнай бядзе. Вельмі хутка, ужо ў 1940 г. бяда прыйшла і ў французкі нацыянальны дом. Пасьля ганебнага разгрому, пасьля нямецкага бліц-крыгу французкія міністры і генэралы менавіта ў Камп'ене падпісалі капітуляцыю сваёй краіны. Але ў заходнікаў, мабыць, праблемы з гістарычнай памяцьцю.

* * *

25 верасьня 2006 г. Нямецкая газэта „Frankfurter Allgemeine Zeitung" піша на тэму нядаўняй сустрэчы Пуціна-Шырака-Мэркэль у французкім Камп'ене. Мэркэль заявіла на сустрэчы, што расейска-эўрапейскае супрацоўніцтва павінна грунтавацца на тым, „што мы зьяўляемся надзейнымі партнёрамі". Мэркэль згадала таксама, што іхнія дамоўленасьці не накіраваныя супраць Польшчы і балтыйскіх краінаў. (Цікава, а як жа „супраць" Беларусі і Украіны?) Пуцін даў шэраг абяцанак. Ён дапусьціць французаў з немцамі да распрацоўкі вялікіх газавых радовішчаў на дне Баранцава мора, якімі цяпер карыстаюцца РФ і ЗША, а таксама ня будзе адбіраць ліцэнзію у французкай фірмы, якая цяпер здабывае газ у Сібіры. Масква будзе цяпер разам з Эўропай разьвіваць касьмічную дзейнасьць. А французкі канцэрн будзе будаваць супэрсучасную дарогу з Масквы ў Пецярбург.

Наш камэнтар: Адным словам, суладдзе інтарэсаў і поўны дэтант. Толькі вось цікава, хто гэта даваў права Парыжу і Берліну выступаць ад імя ўсяе Эўропы на перамовах з крамлёўскім начальнікам? Мы нават з Брусэля ня чулі пра такі афіцыйны мандат. Справа пахне Нюрнбэргам 1938 года, калі абмежаванае кола заходніх лідэраў аддала ў пашчу нямецкім фашыстам Аўстрыю і Чэхаславаччыну. Не выпадкова ў Камп'ене Мэркэль так настойліва запэўнівала Польшчу і прыбалтаў, што ўсё гэта ня супраць іх. Пра беларусаў і украінцаў у каторы раз не згадаў ніхто. Падзел Эўропы на сфэры ўплываў і акупацыяў працягваецца. Толькі ў адрозьненьні ад Мюнхена 1938 года усё „чінно і благородно", усе ў белых пальчатках і ніхто не крычыць „Хайль!".

* * *

25 верасьня 2006 г. Французкая газэта „Le Figaro" таксама перадае з Камп'еня. Пуцін запэўніваў французаў і немцаў у надзейнасьці расейскіх партнёраў: „Мы забясьпечваем Эўропу энэргіяй, а атрымліваем грошы на разьвіцьцё эканомікі". Мэркэль заявіла: „Сустрэча не накіравана ні супраць Польшчы, ні супраць ЗША..." „Гэта так." – гукнуў сьледам за ёю Шырак.

Наш камэнтар: Усе газэты пра тое, як перад лубянскім Хлестаковым апраўдваліся заходнія Бобчынскі з Добчынскім. Ну, сапраўды, пра якія гэта „грошы на разьвіцьцё расейскай эканомікі" распавядаў Пуцін заходняй публіцы? Ведаем цудоўна мы, ведаюць і яны, што ніякога эканамічнага разьвіцьця ў РФ няма, што шалёныя грошы пад нафтавую кан'юнктуру раскрадаюцца крамлёўска-лубянскай дзяржмафіяй або кідаюцца на разьвіцьцё зброі масавага зьнішчэньня ды на тэрарыстычную вайну супраць таго ж Захаду. У каторы ўжо раз чарговыя заходнія лідэры ламаюць камэдыю на тэму „надзейнай і дэмакратычнай Расеі" перад эўрапейскай публікай. Колькі яшчэ будзе паўтарацца гэты антынародны спэктакль? Няўжо ніколі не засьвішча заля, вытурваючы са сцэны цынічных і расперазаных салістаў?

***Валеры Буйвал***

# ЧАРГОВАЕ ПРЫЗНАНЬНЕ ВІКА

Яшчэ 6 жніўня ў расейскіх інтэрнэтвыданьнях зьявілася сэнсацыйнае паведамленьне. Чарговая сэнсацыя ад незабыўнага Ганса Віка, колішняга кіраўніка групы АБСЭ ў Менску, стваральніка і сапраўднага кіраўніка псэўдаапазыцыі ў Беларусі. Вік у чарговы раз „сдал с потрохами" (як кажуць на Лубянцы) сваіх кліентаў. Цытуем расейскую копію нямецкага арыгіналу з „Дойчэ Веле": „Ханс-Георг Вик: Если демократические силы в Беларуси не будут финансироваться из-за рубежа, они исчезнут вообще". І яшчэ адна цікавая цытата зь Віка: „Евросоюз ранее тоже проводил программы по развитию сотрудничества с Беларусью в самых разных сферах, в том числе в области демократии и прав человека. Однако система была такова, что финансировались только те из программ, которые получали одобрение белорусских властей…"

У папярэдніх сваіх прызнаньнях Вік быў больш канкрэтным і паведаміў, што грантаўская дапамога для „аб'яднанай апазыцыі" рабілася ім (прадстаўніком эўрапейскай дэмакратычнай структуры) з санкцыі КГБ РБ. Цяпер Вік не называў канкрэтных інстытуцыяў менскай дыктатуры, якія разам зь ім аплочвалі на працягу гадоў вінцучкоў-лебедзько і іжэ зь імі. Але сэнс выказваньняў ад гэтага не мяняецца. Сказанае цяпер на дыпляматычнай мове чытаецца адназначна на звычайнай чалавечай мове. Вік канстатаваў, што палітычныя путаны адразу ж пакінуць менскую панэль, як толькі ім ня будуць выплочваць грошы.

Сапраўдныя патрыёты (а не падстаўныя і створаныя з санкцыі КГБ РБ) вядуць змаганьне за Беларусь, не спадзяючыся на гранты і не патрабуючы санкцыі КГБ. Пра гэта ведае і сам Вік, і эўрапейскае грамадзтва. Вядома нават з нямецкай гісторыі, што нямецкія антыфашысты змагаліся супраць гітлерызму не за гранты і не з санкцыі гестапа, што падчас французкай акупацыі нямецкія паўстанцы змагаліся супраць акупантаў, ня маючы санкцыі ад Напалеёна.

На вікаўскую заяву напоўніўся „справедлівым гневом" пакрыўджаны Вінцук Вячорка (ён доўга спрабаваў называць сябе „лідэрам БНФ", а цяпер знаходзіцца на дзясятых ролях у мілінкевічаў-калякіных). У „Нар. Волі" за 15 жніўня надрукаваны партрэт „лідэра" і ягоны адлуп Віку, правальшчыку таямніцы палішынэля. Вячорка піша: „Дэмакратычная беларуская справа будзе жыць і пераможа нават тады, калі дапамогі з-за мяжы раптам ня будзе". Вось так – „раптам". Далей ён прыгадвае, як разам з паплечнікамі Дубаўцом і Бяляцкім (вядомымі цяперашнімі архігрантасмокамі) з 1979 г. друкаваў улёткі і езьдзіў „зайцам" на паштовых грузавіках. Тут трэба заў-

важыць, што Вячорка кажа праўду – так яно й было ў 1979 г. і яшчэ нават на пачатку 1990-х гадоў, пакуль Масква і Захад не дамовіліся аб стварэньні ў Беларусі антыбеларускай псэўдаапазыцыі, прысьцёбнутай да шклоўскага рэжыму. Як толькі „зарубежные друзья" запрапанавалі грошы, стомленыя „барбой" рамантыкі грошы ўзялі. Яны заявілі аб тым, што „нацыянальная ідэя сябе вычарпала" (Хадыка) і прагаласілі пераход на пазыцыі прагматызму (палітычнага бізнэсу).

Вячорка і іншыя грантасмокі здрадзілі ідэалам свайго юнацтва. Гэта ёсьць сапраўдная чалавечая трагедыя, якую бачаць усе, акрамя гэтых людзей. Яны зрабіліся марыянэткамі ў руках сілаў, якія імкнуцца зьнішчыць наш народ і Беларускую Дзяржаву. Яны сталі жыць і дзейнічаць пад камандай Віка і з санкцыі КГБ. І ў гэтай сваёй дзейнасьці зайшлі ўжо так далёка, што шляху назад для іх няма.

Застаецца яшчэ адно пытаньне: чаму Ганс Вік у чарговы раз ды так груба здаў сваіх халуёў, сваю агентуру, чаму ён так распрануў іх? Ведаеце, нягледзячы на ўвесь свой прафэсійны цынізм, Гансу Віку таксама „нічто человеческое не чуждо"... Ствараючы на прыканцы 1990-х гадоў падстаўную псэўдаапазыцыю, кіруючы ёю ва ўсіх яе правальных справах, Вік спадзяваўся падзякі ад шклоўскага рэжыму і маскоўскіх гаспадароў. А тыя абышліся зь ім зусім ня так як са Шродарам – ўзялі ды вікінулі нямецкага шпіёна з грукатам за межы РБ. Сумленьня няма, а ўсяроўна крыўдна. Да таго ж, афіцыйная Масква пачала зноў весьці самастойную палітыку, непрадугледжаную томскім пактам Молатава-Рыбэнтропа... э-э, прабачце, Пуціна-Мэркель. Вось і вымушаны берлінскі „хросны бацька" шклоўскай псэўдаапазыцыі нанесьці прэвэнтыўны ўдар па створанай ім жа спэцструктуры. Як у Гогаля: „Я тебя породіл, я тебя і убью..." Сапраўды, нічога новага ў параўнаньні з клясікай. Здрада і служэньне ворагу заўсёды прыводзяць да горкіх вынікаў.

***Янка Базыль***

# КАНФЛІКТ НА МАСКОЎСКАЙ ДАРОЗЕ

Казуліна засудзілі канчаткова. Пяць з паловай гадоў – абсалютна несувымерны прысуд за дробнае парушэньне (разьбіў партрэт Лукашэнкі ў міліцыі. Астатнія абвінавачваньні несур'ёзныя і цалкам палітыканскія.). Максімум, што па закону маглі б прысудзіць Казуліну, – гэта 15 сутак арышту альбо штраф. Але атрымаў неверагодны тэрмін.

З гэтай нагоды я хацеў бы нагадаць пэўным грамадзянам Беларусі некалькі істотных палажэньняў.

Людзі, якія ўваходзяць у палітыку з жаданьнем лёгка навесьці там парадак, павінны ведаць як мінімум два правілы.

***Правіла агульнае:***

Палітыка ёсьць найвышэйшая і асаблівая грамадзкая сфэра дзейнасьці людзей, дзе трэба быць **палітыкам**. Калі ім ня быць, то ні розум, ні адукацыя, ні грошы, ні навуковыя званьні не дапамогуць.

(У палітыцы, дарэчы, нямала абмежаваных і малаадукаваных людзей, неінтэлектуалаў і псіхічна непрадказальных, якія няблага, тым ня менш, спраўляюцца са сваімі, на іх думку, галоўнымі задачамі – ўтрыманьня пасады і ўплыву на грамадзтва.)

***Правіла дастасаванае:***

Ніколі беларускія нацыянальныя інтарэсы не дасягаліся, не дасягаюцца і ня будуць дасягацца пры дапамозе Расеі і расейскай палітыкі. Бо гэта супярэчыць прыродзе дачыненьняў.

Пяцісотгадовая вайна паміж Масковіяй і Літвой была вайной цывілізацыйнай і не на жыцьцё, а на сьмерць. (Паўтаруся: гэта не канфлікт інтарэсаў, гэта вайна на сьмерць.) Па ўсіх плянах, дэклярацыях, дактрынах і дзеяньнях расейцаў, іхняга царызму, бальшавізму, сацыялізму, гэбізму-пуцінізму мы, ліцьвіны-беларусы, павінны зьнікнуць з палітычнай і культурнай мапы сьвету. Расейцы адкрыта і нястомна і ўвесь час пра гэта кажуць (а гісторыя вынішчэньня пацьвярджае).

Беларусы, якія ідуць у палітыку і ігнаруюць гэтую прыроду рэчаў, як правіла, у выніку прыносяць шкоду Беларусі і асабіста сабе. Бо наіўнымі і абсурднымі ёсьць думачкі скарыстаць расейцаў (і найперш расейскія грошы) супраць прарасейскага Лукашэнкі (у той час калі ён патрэбны Расеі).

Тым часам НКВД-КГБ-ФСБ ад сваіх мэтадаў ніколі не адступаецца: скарыстаць наіўнячкоў і, пасьля зрабленьня імі справы, „выплюнуць" іх (а калі ўзьнікнуць „праблемы", то і забіць).

Лёсы Карпенкі, Ганчара, Чыгіра, Марыніча, Казуліна нічаму, аднак, не навучаюць. Аматары сыграць у „апазыцыю" і абдурыць маскоўцаў на мякіне не пераводзяцца. У выніку – абдурваюць самых сябе, бо сьляпы не заблудзіць відушчага.

У дачыненьнях з Расеяй (дакладней, у вечным канфлікце з Расеяй) ёсьць два шляхі – гэта дарожка Лукашэнкі (прамаскоўская палітыка) і – шлях нацыянальна-незалежніцкі (палітыка Беларускага Адраджэньня). Іншых шляхоў („трэціх", „чацьвертых" і т.п.) не існуе. Казулін, Карпенка, Чыгір, Ганчар, Марыніч і іншыя хадзілі дарожкай Лукашэнкі супраць Лукашэнкі (які, паўтараю, Маскве выгадны). У выніку гэтыя асобы былі скарыстаныя ў маскоўскіх палітычных інтрыгах на Беларусі і потым (пасьля выкарыстаньня) кінутыя на волю лёсу (дакладней, на волю Лукашэнкі) альбо зьнішчаныя.

Аналізуючы выказваньні гэтых людзей і датычных да іх (В. Лявонава, А. Мілінкевіча і г.д.), відаць, што ніхто зь іх па сутнасьці глыбока не ўсьведамляе падзеяў і зьместу расейска-лукашэнкаўскай палітыкі. Ніхто не зьбіраецца адмаўляцца ад „дарожкі Лукашэнкі" ў нібыта „змаганьні" з Лукашэнкам. Ніхто не гатовы ісьці дарогай барацьбы супраць расейскай антыбеларускай палітыкі, стаць на нацыянальна-незалежніцкі шлях Беларускага Адраджэньня. Бо гэта ня тыя людзі.

Гэта добра ілюструе, дарэчы, нядаўняя *(20.09.2006)* заява А. Казуліна. Тут поўна пустых прапановаў і пустапарожніх фраз пра „правы чалавека", „рэжым" і „аб'яднаньне" ўсіх супраць рэжыму, апэляцыя да Захаду і г.д. Але ні слова няма пра галоўнае: пра лёс Беларускай незалежнасьці перад палітычнай і эканамічнай агрэсіяй Расеі, пра тое, супраць чаго і за што беларусам трэба змагацца, каб захаваць сваю дзяржаву, мову, культуру, народ і незалежнасьць.

Пішацца, што „А. Лукашэнка разьвязаў халодную грамадзянскую вайну супраць свайго народа", але не гаворыцца, у чым жа сутнасьць гэтай вайны. Бо і фармулёўка няправільная. Не „грамадзянскую вайну" вядзе Лукашэнка, а антынацыянальную, антыбеларускую, (па прыкметах тыпова акупацыйную са зьнешнімі палітычнымі прывязкамі), перасьледуе нацыянальную беларускую моладзь, нацыянальныя сымвалы, мову, культуру, фальсіфікуе нацыянальную гісторыю, зьнішчае нацыянальную літаратуру, нацыянальную навуку, нацыянальны беларускі друк, беларускі інтэрнэт, ліквідуе беларускую школу і выкладаньне па-беларуску, публічна зьдзекуецца з нацыянальнай мовы і блюзьнерыць над памяцьцю Васіля Быкава і Францыска Скарыны.

Гэта ашаламляльная зьява ў XXI стагоддзі. Прамаскоўскай уладай у Беларусі і ад імя ўлады праводзіцца агрэсіўная палітыка этнацыду і вынішчэньня беларускай культуры. Робіцца гэта адкрыта і нахабна. Але маўчаць тут вандроўнікі па маскоўскіх сьцежках, і нічога ня піша Казулін.

Чаму яны маўчаць? Таму што яны самы русіфікатары, якія канфліктуюць з Лукашэнкам па непрынцыповых для нацыі пытаньнях.

***Не бывае дэмакратыі без нацыі і не існуе дэмакратыя без незалежнай дзяржавы.*** Дэмакратыя ёсьць зьява вытворная ад нацыі і дзяржавы. Тым часам цяпер беларуская нацыя і незалежнасьць пад пагрозай зьнішчэньня.

Дык чаму яны ўвесь час гучна плачуць па валасах, трацячы галаву? Таму што гэты лямант зацямняе людзям розум і адводзіць ад разуменьня галоўнай небясьпекі. Масква ўмела падтрымлівае і накіроўвае гэтую палітычную дэмагогію. Гэбэ падтрымлівае – Караганаў (выраблены вораг беларушчыны) занепакоены, бачыце, дэмакратыяй і „правамі чалавека" (русскіх обіжают) на Беларусі.

Дыктатура, этнацыд, інкарпарацыя ёсьць узаемазьвязаныя зьявы. Таму відавочна, што русіфікатары ня могуць мабілізаваць нацыю на барацьбу з дыктатурай, якіх бы філіпік супраць яе яны ні ўжывалі. Урэшце рэшт яны

стануць, як і рэжым, душыць беларускую мову, Беларускую нацыянальную ідэю і Беларускае Адраджэньне. Некаторыя з такіх „дэмакратаў" займаюцца гэтым даўно.

Фальшывыя адносіны да Беларусі і незалежнасьці добра выяўленыя ў наступных словах з заявы Казуліна: „Мы своевременно не смогли оценить свою свободу: в 1991 году мы ее, как и независимость страны, получили без борьбы, словно подарок с небес."

Вось у гэтым і ўся гнюснасьць такіх „дэмакратаў". Напляваць ім на ўсё нашае змаганьне, на ўсе лёсы нашых змагароў, якія яны – нашы героі – паклалі на алтар Беларусі, волі і незалежнасьці, начхаць ім на ўсю нашу нялёгкую барацьбу за незалежнасьць і на ўсё нашае пакаленьне, якое вярнула сабе і ўсім незалежную Беларусь, волю, мову і гісторыю, начхаць на ахвяры, на страты і пакуты і на вялікую нашу перамогу, якой можам ганарыцца ня толькі мы, яшчэ жывыя яе ўдзельнікі, але і ўся Беларусь. Ім напляваць. Яны паўтараюць рэжымныя лукашысцкія прыдумачкі для цяперашніх людзей, што „незалежнасьць звалілася зь неба". Але папярэдне лукашысты вытапталі ўсё, што можна, усе веды пра барацьбу Беларускага Народнага Фронту і пра вяртаньне незалежнасьці, пра гераічнае змаганьне дэпутацкай Апазыцыі БНФ у парляманце за свабоду і сувэрэнітэт Беларусі, ліквідавалі афіцыйную дакумэнтацыю, інфармацыю, друк і нават людзей, зацямнілі і замаўчалі яшчэ помныя і нядаўнія падзеі, наклалі табу на ўспамін аб нацыянальнай рэвалюцыі ў жніўні 1991 года калі была вернута незалежнасьць і аб наступным змаганьні.

Чаму такія людзі, як Казулін, паўтараюць цяпер гэтую прымітыўную антыбеларускую прапаганду пра незалежнасьць „без борьбы" (за якую на справе цэлыя пакаленьні беларусаў аддалі тысячы жыцьцяў)? Яны ж не маладзёны – ўсё памятаюць і ведаюць. А паўтараюць таму, што былі не на нашым, не на адраджэнскім баку. Бо падтрымлівалі расейскую КПСС ды ВЛКСМ, ды Маскву, ды Ельцына, ды КГБ, а некаторыя такія, як Лябедзька, Булахаў, Ганчар, Сініцын, Паўлаў і іншая партыйна-камсамольская намэнклятура (Фядута і т.п.) выступілі адкрыта супраць незалежнасьці і падтрымалі потым Лукашэнку.

Так што нічога дзіўнага ў фармулёўках Казуліна няма. Ён адпаведны сам сабе.

Што датычыць асобы грамадзяніна Казуліна і яго незаконнага асуджэньня на несувымерны тэрмін, то я цалкам далучаюся да тых, хто патрабуе ягонага вызваленьня і перагляду справы, выказваю спачуваньне ягонай сям'і.

Адказнасьць за помсьлівасьць, жорсткасьць і выкарыстаньне судовай машыны супраць гэтага чалавека нясе, безумоўна, Лукашэнка. Думаю, што прыйдзе час, і кожны адкажа за сваё. Судзімасьць з А. Казуліна будзе зьнятая, а пакуты кампэнсаваныя за кошт судоў і суддзяў, што тварылі беззаконьне.

У вольнай беларускай дэмакратычнай дзяржаве, перш за ўсё, будуць адноўленыя законнасьць і справядлівасьць.

***Зянон ПАЗЬНЯК***

*22 верасьня 2006 г.*

# БЕЛАРУСЫ НА ЧОРНАЙ ПРАЦЫ У РАСЕІ

**Паводле апытаньняў незалежных сацыёлягаў, каля трэці грамадзянаў Беларусі хацелі б зьехаць у іншую краіну. І шмат людзей насамрэч зьяжджае. Найвялікшая працоўная эміграцыя беларусаў – у Расею.**

Кастусь Скуратовіч (журналіст): „У кожным беларускім горадзе, які месьціцца каля чыгункі, шмат людзей працуе ў Расеі. Некаторыя едуць на 1-2 тыдні. Нядаўна я быў на сэмінары ў Віцебску. Там прагучала такая інфармацыя: з 1 200 тысяч жыхароў Віцебскай вобласьці каля 400 тысяч працуюць у Маскве й Санкт-Пецярбургу. Тым часам у першай палове 2006 году ў Беларусь прыехала каля 5 тысячаў чалавек, а выехала – 2 тысячы. Міграцыйны прырост – 3 тысячы чалавек. Прычым, у Беларусь едуць людзі з Расеі, Казахстану, Сярэдняй Азіі дажываць. Гэта пераважна пэнсіянэры. А зь Беларусі зьяжджаюць працаздольныя, тыя, хто хоча працаваць, імкнецца да добрага заробку. Дарэчы, з афіцыйнай статыстыкі, каля 600-700 тысячаў працаздольнага насельніцтва Беларусі не занятае ў легальнай эканоміцы краіны.

Нядаўна ў Ганцавічах пахавалі чатырох беларусаў, што загінулі, вяртаючыся з заробкаў у Расеі. Вельмі шмат выпадкаў (гэта ўжо рэгулярная зьява) бясьсьледнага зьнікненьня беларусаў, якія паехалі на заробкі на ўсход. Працоўная эміграцыя беларусаў у Расею набыла масавы характар. Прычым, нягледзячы на міждзяржаўныя дамовы, беларускія грамадзяне працуюць без усялякай прававой і сацыяльнай абароны ў шэрым (крымінальным) сэктары расейскай эканомікі. Павялічваецца колькасьць трагічных выпадкаў.

***-інфа–*** *(Паводле радыё Свабода)*

# „ЯНЫ АДПОМСЬЦЯЦЬ ЗА ЎСІХ ПАКУТНІКАЎ".

**Пра тое, наколькі зьмянілася жыцьцё ў Беларусі за апошнія дванаццаць гадоў, піша Мікола Канаховіч з Пружанаў**: „На гэта пытаньне я адказваю з болем у сэрцы й са сьлязьмі на вачах. Памятаю той цёплы сонечны дзень, калі ўпершыню ў нашым мястэчку над будынкам райвыканкаму ўзьнімалі бел-чырвона-белы сьцяг. На плошчы сабралася шмат людзей. Хто радаваўся, хто лаяўся, хто – пазяхаў. Асабіста ж для мяне гэта быў самы шчасьлівы дзень пасьля нараджэньня першага майго дзіцяці. Я, не саромеючыся, стаў тады на калені перад сьцягам і дзячыў Богу, што мая радзіма нарэшце стала па-сапраўднаму незалежнай і вольнай…"

Далей аўтар піша пра няспраўджаныя спадзяваньні й пра сёньняшнія беларускія рэаліі. „Страх быць звольненым з працы, страх за беларускасьць, страх за палітычныя й рэлігійныя пракананьні, за будучыню сваіх дзяцей і ўнукаў… Страхам у нас прасякнута ўсё. І гэта прыводзіць да розных хвароб, да алькагалізму, наркотыкаў, распаду сем'яў. Калі пішуць, што за апошнія 12 гадоў стала лепей і весялей жыць, – ня верце. Бо такое можа сказаць альбо правакатар, альбо люты вораг Беларусі… За 12 гадоў беларускі народ ня стаў паўнавартаснай нацыяй (як, напрыклад, нашы суседзі), а ператварыўся ў духоўнага нябожчыка. Што тычыцца мяне асабіста, дык я ад гэтага рэжыму пакутую штодзённа. Бо ж не апускаюся да ўзроўню чарвяка, а змагаюся за сваю чалавечую годнасьць. Аднаго разу, едучы ў цягніку Берасьце – Менск, я меў неасьцярожнасьць пацікавіцца ў двух дужых кантралёраў, чаму на чыгунцы ігнаруецца дзяржаўная беларуская мова. Ад такога пытаньня яны папросту прывар'яцелі – ня выпусьцілі мяне на патрэбнай станцыі Аранчыцы, а выкінулі з вагону на перагоне Аранчыцы–Бяроза Картуская. Тое пытаньне каштавала мне страчанага здароўя. …Пра адно шкадую – што мне ўжо цяпер пад семдзесят. Але радуюся, што падрастаюць унукі. Упэўнены: яны адпомсьцяць за ўсіх пакутнікаў".

***(Паводле радыё «Свабода»)***

# ПРЭЗЭНТАЦЫЯ КНІГІ СЯРГЕЯ НАВУМЧЫКА

У Нью-Ёрку, у грамадзкай залі Сабору Сьв. Кірылы Тураўскага Беларускай аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы адбылася прэзэнтацыя кнігі Сяргея Навумчыка „Сем гадоў Адраджэньня", прысьвечанай падзеям 1988-1995 гг.

Сяргей Навумчык сказаў, што імкнуўся да аб'ектыўнасьці ў аналізе падзеяў, хаця палічыў патрэбным даць і ўласную ацэнку фактаў і асобаў. „Але

гэта не мэмуары, мэмуары будуць калі-небудзь пазьней," – сказаў аўтар і выказаў спадзяваньне, што пра гэты пэрыяд напішуць ня толькі дэпутаты. „Апазыцыя БНФ не дамаглася б посьпеху, калі б не падтрымка тысячаў людзей за сьценамі Вярхоўнага Савета," – сказаў Навумчык.

Зянон Пазьняк сказаў: „Кніжка Сяргея Навумчыка важная тым, што яна шмат якія падзеі паказвае знутры. У сёньняшняй Беларусі людзі, якія дамагліся аднаўленьня незалежнасьці, выкінутыя на пэрыфэрыю палітычнага і грамадзкага жыцьця, яны апляваныя, многія зь іх бяз працы. Пра іх ніхто не прыгадвае. І паколькі мы яшчэ жывыя, мы ўзяліся самі апісаць тыя падзеі, і кніга Сяргея Навумчыка – гэта „першая ластаўка".

Дэпутат і член фракцыі БНФ Менскага гарсавету ў 1990-1995гг. Галіна Пазьняк (Вашчанка) прыгадала нацыянальны ўздым, які панаваў у Беларусі ў пачатку 1990-х гадоў: „Чытаючы кнігу, я нібыта зноў перажыла слаўныя падзеі".

Старшыня Рады БНР Івонка Сурвіла сказала, што гэтае выданьне – „першая кніга, якая апісвае найважнейшы нядаўні пэрыяд гісторыі Беларусі."

* * *

20–га жніўня ў Вязынцы адбылася прэзэнтацыя кнігі Сяргея Навумчыка. Актывісты Кансэрватыўна-хрысьціянскай партыі БНФ правялі ў музэі Янкі Купалы ў Вязынцы пад Менскам імпрэзу прысьвечаную падзеям маскоўскага путчу 1991 году. Пасьля тых падзеяў 15-гадовай даўніны Беларусь стала незалежнай дзяржавай. У нядзельнай імпрэзе ўдзельнічалі дэпутаты Вярхоўнага Савету 12-га скліканьня ад Апазыцыі БНФ, якія прэзэнтавалі новую кнігу свайго калегі, а цяпер супрацоўніка радыё Свабода Сяргея Навумчыка.

Моладзь, што прысутнічала на імпрэзе, так адрэагавала на выхад кнігі Сяргея Навумчыка:

***(Уладзімер:)*** „Гэта адзіная кніга, дзе ёсьць сыстэматызаваны матэрыял тых часоў. І агульнае такое ўражаньне, пра працу, што была зробленая ў тыя часы, якая была вельмі складаная".

***(Аляксей:)*** „Вельмі цікава было пабачыць людзей, якія стварылі гэтую гісторыю. І сапраўды, тую інфармацыю цяпер нідзе не знойдзеш. Гэта было вельмі карысна і цікава".

***(Ганна:)*** „На сёньняшні дзень вельмі мала інфармацыі пра падзеі таго часу. Гэтая імпрэза была вельмі добрай інфармацыяй пра кніжку Сяргея Навумчыка, якая распавядае пра тыя падзеі. Відаць, гэта толькі фрагмэнты, але фрагмэнты вельмі важныя. Я думаю, што многія мае сябры захочуць прачытаць гэую кніжку".

***(Паводле радыё „ Свабода")***

## ПРЭМІІ ПЭН-ЦЭНТРУ СЯРГЕЮ НАВУМЧЫКУ І ЛЕАНІДУ МАРАКОВУ

Сяргей Навумчык ушанараваны літаратурнай прэміяй Беларускага ПЭН-цэнтру імя Алеся Адамовіча за кнігу „Сем гадоў Адраджэньня", прысьвечаную падзеям 1988—1995 гадоў. Прэмію ПЭН-цэнтру імя Францішка Багушэвіча атрымаў пісьменьнік Леанід Маракоў за шматгадовую працу „Рэпрэсаваныя літаратары, навукоўцы, работнікі асьветы, грамадзкія і культурныя дзеячы Беларусі".

Дэпутат Вярхоўнага Савету Беларусі 12-га скліканьня ад апазыцыі БНФ, а цяпер супрацоўнік Радыё Свабода Сяргей Навумчык ня змог прыехаць на ўручэньне прэміі імя Алеся Адамовіча. Ягоны зварот да сябраў ПЭН-цэнтру зачытаў на паседжаньні дырэктар Беларускай службы Радыё Свабода Аляксандар Лукашук.

У гэты ж дзень (5 верасьня) прэмію Беларускага ПЭН-цэнтру імя Францішка Багушэвіча атрымаў пісьменьнік Леанід Маракоў. Атрымоўваючы ганаровы дыплём, спадар Маракоў кажа пра сваю новую кнігу:

***(Маракоў:)*** „Удалося адшукаць біяграфіі ўсіх расстраляных 29 кастрычніка 1937 году. Але самае галоўнае — удалося адшукаць зьвесткі пра тых, хто расстрэльваў і катаваў дзеячаў культуры, калі ў адну ноч яны вынішчалі амаль усю інтэлектуальную эліту Беларусі".

***Ганна Соусь*** *(радыё Свабода)*

## АПОВЯД ЧЫСТАГА СУМЛЕНЬНЯ

Кніга дэпутата Вярхоўнага Савета 12 – га скліканьня Сяргея Навумчыка ***„ Сем гадоў Адраджэньня альбо фрагмэнты найноўшай беларускай гісторыі (1988-1995)"***, якая выйшла нядаўна ў Варшаве *(Варшава – „ Беларускія Ведамасьці", Прага – „ Člověk v tísni", 2006 г.),* захапляе з першай старонкі. Прачытаўшы яе, уражвае, з аднаго боку, як дакладна перададзена атмасфэра беларускага Адраджэньня, зь іншага – сам аповяд пра ахвярную працу Апазыцыі БНФ у Вярхоўным Савеце.

У тых, хто быў удзельнікам падзеяў ці падтрымліваў Апазыцыю БНФ у Вярхоўным Савеце на плошчы Незалежнасьці, кніга абуджае шмат асацыяцыяў – ўспамінаў і аднаўляе ў памяці ўздым і аптымізм 90-х.

Іншым, маладым, хто па ўзросту тады ня мог асэнсоўваць тыя гістарычныя перамены, кніга Сяргея Навумчыка раскрывае праўдзівыя падзеі нядаўняга часу. І гэта надзвычай важна, бо аднаўленьне незалежнасьці не „звалілася зь неба" (як хлусяць антыбеларускія прапагандысты), а было здабытае (ў выніку змаганьня пакаленьняў беларусаў і пры падтрымцы грамадзтва) неверагодна цяжкай, гераічнай і ахвярнай працай нешматлікай фракцыі фронтаўскіх дэпутатаў ў парляманце – авангардам сапраўднай беларускай эліты. Дзякуючы іх дзейнасьці, не абарвалася „нітка шчасьця", пераемнасьць адраджэньня Беларускага духа ў пакаленьнях, і беларусы як народ не сыйшлі ў небыцьцё. А гэта цалкам магло стацца, каб не адбыўся Акт Незалежнасьці і Беларусь засталася б часткай імпэрскай Расеі. Менавіта гэтага дамагалася сваёй коснасьцю і саветызмам большасьць прамаскоўскага Вярхоўнага Савета БССР 12-га скліканьня.

Я памятаю гэтыя часы і атмасфэру тае пары, бо разам з авангардам беларускага грамадзтва таксама вырастала з жыцьця і ўзмацнялася мая нацыянальная сьведамасьць.

Расказваючы, што папярэднічала парляманцкай дзейнасьці адраджэнцаў, Сяргей Навумчык піша пра разгон *„ Дзядоў-88"*, „які меў шырокі розгалас" у грамадзтве. І я памятаю, як гэта было, як (нібы сабак спусьцілі з ланцуга) „клеймили позором" „неформалов" (гэта пра нас) ва ўсіх дзяржаўных СМІ (а іншых СМІ не было), як кожны дзень зьяўляўся шэраг артыкулаў-падманаў, як абзывалі нас „фашыстамі" ды іншымі абразьлівымі словамі за нашую прагу свабоды і незалежнасьці ад страшнай імпэрыі, як нас запалохвалі і як мы вучыліся не баяцца.

„Пашырыліся патрабаваньні аб беларусізацыі", – піша аўтар, які тады жыў у Віцебску. А я ўспамінаю пачатак 1990 года – тры дні мітынгаў у Менску, калі цалкам савецкі Вярхоўны Савет БССР 11-га скліканьня прымаў Закон аб мовах, як спрачаліся савецкія дэпутаты, як лямантаваў, ненавідзячы беларускую мову, лімітаваны „дэпутат БССР" артыст Менскага рускага тэатра Янкоўскі ды выступаў супраць адзінай дзяржаўнай беларускай мовы (фрагмэнты гэтага абмеркаваньня паказвалі ў „Навінах" на ТБ"), і як патрабаваў народ прыняцьця гэтага Закону.

У першы дзень абмеркаваньня Закону ў Вярхоўным Савеце ўся плошча Незалежнасьці (тады Леніна) па закліку Беларускага Народнага Фронту была запоўнена менчукамі. Мы патрабавалі, каб адзінай дзяржаўнай мовай стала беларуская мова.

Назаўтра дэпутацкія дэбаты працягваліся, і тысячы людзей зноў сабраліся ля Вярхоўнага Савета, выкрыквалі лёзунгі і патрабаваньні. Мы былі ўсе разам, знаёмыя і незнаёмыя беларусы, мы адчулі сябе народам.

На трэці дзень абмеркаваньня нам афіцыйна дазволілі мітынг каля Дому палітасьветы, і тысячы менчукоў хлынулі туды. Людзі былі настроеныя на перамогу. Гэта радвала і ўздымала. Упершыню ў БССР тысячы людзей узьняліся ў абарону беларускай мовы. Шмат хто зь іх гаварыў па-руску,



***На прэзэнтацыі кнігі С. Навумчыка ў Нью-Ёрку. Зь лева на права: Сяргей Навумчык, Галіна Пазьняк, Антон Шукелойць.***

але чыстая хваля Адраджэньня ўскалыхнула ў беларусах тое, што 70 гадоў спала ў душах за саветамі.

С. Навумчык успамінае вясну 1990-га – выбары ў Вярхоўны Савет БССР і якія неверагодныя перашкоды стваралі савецкія ўлады кандыдатам ад Фронта. І я ўспамінаю, як у Менску Фронт аб'яднаў усіх вылучаных сваіх кандыдатаў у Вярхоўны і мясцовыя Саветы. У Фронце была наладжана вучоба кандыдатаў усіх узроўняў. Мы слухалі лекцыі спэцыялістаў розных галінаў аб будучай дэпутацкай дзейнасьці (эканоміка, гаспадарка, гісторыя, паліталёгія і г.д.). Такую ж „вучобу" правёў 2-3 разы і Райвыканкам Маскоўскага раёну Менска, на тэрыторыі якога я жыла і, як кандыдат у дэпутаты Гарсавета, прысутнічала на гэтых паседжаньнях.

Памятаю, як пасьля заканчэньня лекцыі мяне запрасіў у кабінет адзін чыноўнік райвыканкаму. „В доверительной беседе" ён паспрабаваў „расплюшчыць" мне вочы на некаторых дзеячоў у нашым адраджэнцкім руху. Ён гаварыў, што да нас „уліліся" гэбісты, называў вядомыя прозьвішчы. „Ці ж гэта ваша кампанія?" – скончыў ён сваю „прапрацоўку". Ды я не зьбіралася верыць ягонаму „шчыраму" голасу, хоць (час паказаў) КГБ, сапраўды, рабіў апэратыўныя крокі, каб ня даць узмацніцца Адраджэньню.

Але не гэбэ вырашаў тады лёс будучай незалежнай Беларусі. Яго вырашалі тады лепшыя беларускія дзеячы Апазыцыі БНФ у Вярхоўным Савеце, Беларускі народ і Беларуская адраджэнцкая плошча. Высілкі КГБ маглі прынесьці пэўную канкрэтную шкоду, але паўплываць на народны ўздым яны не маглі.

Галоўная каштоўнасьць кнігі Сяргея Навумчыка – расказ пра парляманцкую дзейнасьць Апазыцыі БНФ. Гэты расповяд для нас вельмі істотны, бо зыходзіць з „першых вуснаў" сумленнага чалавека, які расказвае так, як было, абапіраючыся на стэнаграмы паседжаньняў Вярхоўнага Савету. Тут усё – праўда. Сяргей Навумчык раскрывае знутры характэрны працэс змаганьня з рэакцыйнай дэпутацкай большасьцю, іх няздольнасьць да нацыянальнай палітычнай дзейнасьці, неразуменьне паняцьцяў „суверэнітэт", „геапалітычная сітуацыя", „незалежнасьць", „нацыянальныя інтарэсы", паказвае іхнюю воўчую ўпартасьць супраць беларускага Адраджэньня і падтрымку рашэньняў у інтарэсах Масквы. Тыя, хто тады назіраў за дзейнасьцю Апазыцыі БНФ праз СМІ, не маглі ведаць пра ўсе цяжкасьці прыняцьця гістарычных рашэньняў.

Апазыцыя БНФ вынесла на 2-ю сэсію некалькі дзясяткаў заканадаўчых прапаноў і законапраектаў, піша аўтар. І зьнешне гэта ўспрымаецца як належнае. Але за гэтым сьціплым выказваньнем – бяссонныя ночы, абмеркаваньні, ахвяраваньне ўласным асабістым жыцьцём на карысьць Бацькаўшчыны. І такое цяжкае жыцьцё доўжылася амаль шэсьць гадоў. За гэты час сябры Апазыцыі БНФ паступова станавіліся прафэсійнымі палітыкамі-змагарамі.

А напачатку гэта была неверагодна цяжкая праца першапраходцаў. Некалькі разоў я прысутнічала на абмеркаваньнях палітычных пытаньняў у Апазыцыі БНФ (знаходзячыся ў Вярхоўным Савеце па агульнафронтаўскіх справах і як дэпутат Менгарсавета). Я насамрэч бачыла, як выпрацоўвалася палітычная тактыка ў працэсе абмеркаваньня пэўнай палітычнай праблемы. Дыскусія, аргумэнтаваныя спрэчкі давалі магчымасьць дэпутатам Апазыцыі БНФ разглядаць пытаньне з усіх бакоў і выпрацоўваць аптымальныя рашэньні. Прытым, што характэрна, усе шукалі правільнае дзеяньне і дыскутавалі без амбіцыяў, агульная справа была над усім. Гаварылі канкрэтна, коратка і па тэме (быў рэгламант і калі хто адыходзіў у бочныя разважаньні, то старшыня тут жа выпраўляў становішча і ніхто ня крыўдзіўся) І ўжо калі прымалі рашэньне, яно абавязвала кожнага і ўсе яго трымаліся.

Але іхняя дэпутацкая праца тым не абмяжоўвалася. Гэта была яшчэ свайго роду і ў высокай ступені творчая дзейнасьць, дзе трэба было арыентавацца ў сітуацыі непасрэдна ў Авальнай залі. Іхныя калектыўныя „экспромты" былі бліскучыя. Чытаючы пра абмеркаваньне закона аб адкліканьні дэпутатаў, аб прыняцьці Дэклярацыі аб суверэнітэце і інш., зноў перажываеш цяжкія моманты змаганьня. І узьнікае пачуцьцё найвышэйшага захапленьня ад дасьціпнасьці і агульнага інтэлекту геаічнай Апазіцыі БНФ у Вярхоўным Савеце, ад апэратыўнасьці іхняга мысленьня, ад гнуткага валоданьня сітуацыяй.

Думаю, што парлямантарам нават самых магутных дзяржаваў сьвету можна б было павучыцца ў беларускіх герояў – Апазыцыі БНФ у Вярхоўным Савеце. Настолькі яны былі актыўныя, наступальныя, самаахвярныя, зьядналыя і разумныя.

Аўтар нагадвае нам, як цаной вялікіх намаганьняў ішоў працэс вяртаньня беларускасьці, і які страшэнны націск праімпэрскіх сілаў (у якіх была і ўлада, і СМІ) прыйшлося стрымліваць адраджэнцам, успамінае і публікацыю ліста групы бацькоў з Рагачова. І я цалкам пацьвярджаю праўду ягоных слоў.

У сталіцы Беларусі ўсе пытаньні адраджэньня беларускасьці дзіцячых установаў курыравала Камісія па адукацыі Менгарсавета, якая праводзіла пільны кантроль за гарадзкім Упраўленьнем адукацыі па бесперабойным пашырэньні беларускіх школаў у Менску. Нас (дэпутатаў Камісіі) цікавіла таксама, як да гэтага працэсу адносяцца бацькі навучэнцаў і настаўнікі. З усёй адказнасьцю канстатую: перавод садкоў і школаў у статус беларускамоўных з боку настаўнікаў і бацькоў успрымаўся прыхільна – мы правялі сотні перамоваў і сустрэчаў і пераканаліся ў гэтым. А гэтак званыя „калектыўныя лісты" бацькоў і іншая праца „пятай калёны" – гэта справа шалёнай антыбеларушчыны, кіруючы цэнтар якой, зразумела, быў у Крамлі (а дакладней – на Лубянцы).

Але адраджэнцы „трымалі ўдар". Сябры Камісіі Менгарсавета па адукацыі праводзілі сходы ва Упраўленьні транспарту Менска, у Маскоўскім РАУС, ва ўпраўленьні гандлю, у некаторых цэнтральных крамах. Мы выкарыстоўвалі любы шанец, каб увасобіць ідэі беларускай незалежнасьці. Беларускія школы-садкі расьлі, як грыбы. Але усё, як піша С. Навумчык, „даводзілася „выбіваць", бо кебічаўскае чынавенства моцна супраціўлялася адраджэньню беларускасьці.

Узгадваючы пра падзеі тых часоў, аўтар часам дае характарыстыку некаторым вядомым ў беларускім грамадзтве асобам з палітычнага пункту гледжаньня. Шмат добрых слоў сказана пра двух славутых беларусаў, якія адразу падтрымалі Фронт – Васіля Быкава і Рыгора Барадуліна. Цікавыя фрагмэнты адносна старшыні Камісіі па культуры і адукацыі Вярхоўнага Савета Ніла Гілевіча прымусілі і мяне ўспомніць выпадак з майго дэпутацкага жыцьця.

У 1990 г. у Камісію па адукацыі Менгарсавета зьвярнуліся ініцыятары стварэньня пры БДУ беларускага ліцэя з фізіка-матэматычным ухілам. Без ЦК КПБ вырашыць гэта тады было немагчыма. Мы са старшынёй камісіі Вольгай Кузьміч вырашылі зьвярнуцца да старшыні адпаведнай камісіі

Вярхоўнага Савета Ніла Гілевіча і папрасілі яго схадзіць разам з намі да сакратара ЦК КПБ Камая па пытаньні адкрыцьця ліцэю.

Рэакцыя Н. С. Гілевіча была для нас зусім нечаканая. Ён катэгарычна і нават з абурэньнем адмовіўся ісьці з намі ў ЦК партыі, бо мы былі дэпутатамі Менскага Савета, а ён – Вярхоўнага. Ён лічыў сябе вышэйшым за нас. І таму з намі яму было як бы не з рукі, не тая субардынацыя. Мы аслупянелі ад такой (проста скажам, азіяцкай) лёгікі. Вось табе і агульны інтарэс, і „адданасьць ідэі", вось табе і агульнае змаганьне за мову.



*Дэбаты пра незалежнасьць на сесіі ВС. Ля мікрафона Сяргей Навумчык і Генадзь Майсееў.*

(Фота: З кнігі С. Навумчыка „Сем гадоў адраджэньня" ...)

Мы выйшлі зь Вярхоўнага Савета расчараваныя, бо лічылі, што зараз галоўнае – беларушчына, а не нейкія там рэгаліі... Аднак яшчэ існаваў Савецкі Саюз і людзі, што спадзяваліся на камуністычную ўладу, паводзілі сябе па-савецку.

У грамадзтве бытуе такая думка, што палітыкай (як, дарэчы, і педагогікай) можа займацца любы разумны чалавек. Практыка, аднак, паказвае, што гэта ня так. Можна быць добрым вучоным, пісьменьнікам, лекарам ці юрыстам, а ў палітыцы, дзе трэба кіравацца агульнанацыянальным інтарэсам, часам уласныя амбіцыі, прывязанасьць і абмежаванасьць моцна перашкаджаюць. (Тады, дарэчы, беларускі ліцэй пры БДУ з фізіка-матэматычны ухілам мы адваявалі, але прайшоў час, і тыя, хто ўзначаліў ліцэй і біў сябе ў грудзі, што ён будзе беларускамоўным, здрадзілі нашаму змаганьню і перайшлі на мову расейскую... Было і такое, на жаль.)

І яшчэ адна асоба, пра якую абсалютна праўдзіва гаворыць аўтар кнігі С. Навумчык – гэта Станіслаў Шушкевіч. Памятаю, як моцна, крок за крокам, ён расчароўваў усіх тых адраджэнцаў, хто на яго спачатку так спадзяваўся.

Калі ў 1989 г. пачалося вылучэньне кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Савета СССР, увесь Фронт узмоцнена змагаўся за вылучэньне сваіх кандыдатаў. Але зарэгістраваць фронтаўцаў тады (па выбарчым законе СССР) не ўдалося, і Фронт заклікаў сваіх сяброў дапамагаць С.С. Шушкевічу (а Шушкевіч абавязаўся падтрымліваць беларускія адраджэнскія каштоўнасьці і фронтаўскія прынцыпы). Бяз гэтай нашай дапамогі С. Шушкевіч стаць двойчы дэпутатам (СССР і БССР) ня змог бы. Усю ягоную выбарчую кампанію падрыхтавалі і правялі фронтаўцы. Мы ж верылі яго словам аб адданасьці Беларусі. Я добра памятаю тыя змагарныя дні. Мы хадзілі па кватэрах, клеілі лістоўкі, агітавалі. Найбольш гэтыя выбарчыя кампаніі памятаюць мае ногі і ногі шматлікіх сяброў Фронту – колькі было выхаджана па раёнах, вуліцах, дварах і прыступках менскіх дамоў. Увесь Фронт агітаваў за Шушкевіча.

Потым, назіраючы сэсіі ВС па ТБ, я ня раз з горыччу шкадавала, што столькі сілаў аддала на змаганьне за С. Шушкевіча, так расчараваў нас гэты чалавек – шукальнік згоды (як ён сам вызначаў сваю пазыцыю), а на справе – ня моцны чалавек, высокая пасада якога аказалася яму не па плячу і прынесла так шмат прыкрасьцяў і няспраўджаных надзей адраджэнцам Беларусі. І зараз, чытаючы кнігу, гэтае пачуцьцё ўзьнікае зноў і зноў, ад старонкі да старонкі, бо у самыя крытычныя моманты, дзе патрэбна была актыўная пазыцыя С. Шушкевіча, ён часта маладушнічаў, марудзіў, угінаўся і марнаваў нацыянальныя магчымасьці Беларусі.

Чытаючы старонкі, прысьвечаныя барацьбе Апазыцыі БНФ за вяртаньне Незалежнасьці, мы бачым, як цяжка здабывалася Незалежнасьць, як шмат што залежыла ад палітычнай інтуіцыі, рашучасьці і інтэлекту дэпутатаў-фронтаўцаў. Абмежаванасьць, коснасьць і цынізм ворагаў беларушчыны ўражваюць, хоць расказ ідзе стрымана. Бачым і антынезалежніцкую пазыцыю тых, хто сёньня выступае ў ролі „апазыцыі" і барацьбітоў, з рэжымам.

Пацьвярджаецца старая праўда: прыгожа і востра здольны гаварыць шмат хто. Але за аднымі і тымі ж словамі можа стаяць супрацьлеглае: шчырасьць і хітрасьць. І каб адрозьніваць адно ад другога, у палітыцы, як нідзе, трэба ведаць, што гэта за чалавек, якая яго „гісторыя", за што ён змагаўся ўчора, 5-10 гадоў таму і ці падтрымліваў ён нацыянальныя беларускія інтарэсы адкрыта, не хаваючыся пад лаву. Інакш мы рызыкуем быць моцна падманутымі.

Здраднікі беларушчыны былі раней, на жаль, ёсьць яны і сёньня. Але каб учарашні непрыяцель беларускіх інтарэсаў ператварыўся сёньня ў „змагара" за іх – гэта ўжо падазрона (хоць такое і здараецца ў гісторыі барацьбы). А менавіта дзейнасьць перакідчыкаў, пра якіх мы чытаем у кнізе С. Навумчыка, прывяла да сёньняшняга бездапаможнага стану. Памятаю трансьляцыі па ТБ сэсіяў Вярхоўнага Савету позна ноччу, а 1-й-2-й гадзіне. Тады думалася: ну, здаецца, пазабіваў бы гэтых рэтраградаў, гэтую прадажную дэпутацкую большасьць. А сёньня гэтыя лябедзькі-калякіны прафануюць змаганьне і тлумяць Адраджэньне, начапіўшы маскі „апазыцыі".

Кніга С. Навумчыка дапамагае аднавіць у памяці шмат што. Напрыклад, як несур'ёзна ўспрымаўся тады дэпутат А. Лукашэнка ў Вярхоўным Савеце і ў адраджэнцкім грамадзтве. Калі мы зьбіралі подпісы ля Галоўпаштамта за фронтаўскага кандыдата ў прэзыдэнты, каля нас заўсёды быў тлум народу. Людзі шчыра падпісваліся. І да нас як правіла „прымазваліся" 2-3 зборшчыкі за Лукашэнку. Мы са зьдзіўленьнем глядзелі ў іх бок, (да іх падыходзілі людзі неахвотна і мала) і не маглі надзівіцца, як яны могуць сур'ёзна займацца гэткай беспэрспэктыўнай справай. Што Лукашэнка, мякка кажучы, „ня цягне" на прэзыдэнта – для нас было настолькі відавочна, што мы толькі ўсьміхаліся... І гісторыя навучыла нас, што ў адказныя часы барацьбы трэба ставіцца вельмі сур'ёзна да праціўнікаў, да ўсіх праяваў гэтай барацьбы і ня скідваць з рахунку нават самыя на першы погляд бязглуздыя „праекты" супернікаў.

Кніга С. Навумчыка выдатна ілюструе, што палітыку можна і патрэбна рабіць чыстымі рукамі, і пісаць пра яе таксама – праўдзіва, так, як было. Для гэтага неабходна толькі мець чыстае сумленьне, шчырае сэрца беларуса і журналісцкі талент, як у Сяргея Навумчыка.

Добра відаць, што пераацаніць унікальны палітычны подзьвіг дэпутатаў парляманцкай Апазыцыі БНФ немагчыма. Яны сыгралі вызначальную ролю ў аднаўленьні незалежнасьці Беларусі. Мінае час, настала цяжкая пара, некаторыя зь іх адыйшлі ад актыўнага змаганьня, некаторыя ўжо адышлі з жыцьця... Але за тое, што яны рабілі і зрабілі тады, у 90-х, – за гэта ім усім нізкі паклон і пажаданьне быць годнымі самых сябе й надалей.

***Галіна Пазьняк***

*2006 г.*

## АДКАЗНАСЬЦЬ І САЛІДАРНАСЬЦЬ

Нядаўна ў адной з дыскусіяў у Інтэрнэце, датычнай публікацыі ў АРХЭ матэрыялаў пра зьбіцьцё ў залі парляманту дэпутатаў Апазыцыі БНФ у Вярхоўным Савеце 12-га скліаньня, Сяргей Навумчык выказаў такія меркаваньні:

«З самага пачатку мяне насьцярожыла просьба даць ацэнкі калегам па парляманцкай Апазыцыі. Асабістыя ацэнкі Пазьняку, Голубеву, Баршчэўскаму, Садоўскаму, Беленькаму, Папкову, Трусаву і іншым калегам па Апазыцыі БНФ лічу магчымым даваць толькі пасьля таго, як у грамадзкай сьвядомасьці гэтыя асобы займуць месца, належнае палітыкам, якія аднавілі Незалежнасьць дзяржавы, і якое падобныя пэрсоны звычайна займаюць у іншых краінах. Вось калі гэтыя асобы будуць палітычна кананізаваныя, калі зьявяцца на паштовых марках ці грашовых купюрах – тады можна будзе напісаць, хто мог занадта імпульсіўна паспрачацца, хто быў занадта патрабавальны, хто менш, хто мог выпіць лішнія сто грамаў і г.д. Ва ўсялякім разе, пакуль гэтыя людзі абліваюцца брудам і ў афіцыйным друку і ў неафіцыйным – ніхто не пачуе ад мяне ні слова адносна іх асабістых якасьцяў.»

Думкі, якія сфармуляваў Сяргей Навумчык – гэта вельмі правільная і разумная пазыцыя ў існуючых абставінах. Мы, дэпутаты Апазыцыі БНФ у Вярхоўным Савеце XII скліканьня, мусім памятаць пра сваю адказнасьць перад гісторыяй, адзін перад адным і перад справай, якая воляю лёсу стала галоўнай ў нашым жыцьці. Мы павінны разумець, што абплёўваньне, паніжэньне і затоптваньне нашай дзейнасьці ёсьць адна з прыярытэтных задачаў антыбеларускага рэжыму, якая робіцца (і будзе рабіцца) рознымі мэтадамі і рознымі людзьмі.

Ніхто лепш за нас ня ведае Лукашэнку і усю гэтую публіку з нашага Вярхоўнага Савета, якая служыць цяпер рэжыму ды прыкідваецца „дэмакратамі”. Ня будзем губляцца перад ціскам, словаблудзтвам, паніжэньнем і хлусьнёй. Нашая салідарнасьць, пачуцьцё абавязку і ўсьведамленьне сваёй ролі павінна быць вышэй. Кожны рэжым мае свой канец. Скончыцца русіфікацыя і цемрашальства, вернецца павага і справядлівасьць. І нішто добрае, сьветлае, справядлівае не загіне.

***Зянон Пазьняк***

*30 верасьня 2006 г.*

## „ЦІХА-ЦІХА ПАГУЛЯЕМ”

25 жніўня, у Дзень Аднаўленьня Незалежнасьці Беларусі, у Менску на балоце „Бангалор” адбыўся канцэрт рок-гуртоў. Перад канцэртам выступоўцы папярэдзілі моладзь каб не ўздымалі беларускія бел-чырвона-белыя сьцягі, бо міліцыянты могуць спыніць канцэрт (рок жа, відаць, важнейшы чым сьцяг).

Як гэта ўсё па-рабску! Нікаму чамусьці ў галаву не прыходзіць, што артысты не нясуць адказнасьці за гледачоў, нават калі міліцыя гэткім нікчэмным чынам хоча ўзяць іх у закладнікі. Прапануюць ў Дзень Незалежнасьці не змагацца за годнасьць, за сьцяг, а слухаць іхны „рок”. (Хаця, каму патрэбны той „рок” без нацыянальнага сьцяга? Гэта ўжо не рок.) Прапануюць выцірацца, калі плююць у твар. Як гэта ўсё знаёма ў нашчадкаў савецкай мэнтальнасьці. Добра яшчэ, што знайшлося некалькі хлопцаў і дзяўчат, што не паслухаліся мудрых пяшкуроў і ўзьнялі наш Беларускі Бел-Чырвона-Белыя Сьцяг.

***Мірон М.***

## ВУЧЫМСЯ Ў ЭСТОНЦАЎ

***Згадваю, як недзе на пачатку 1980-х цэнтральнае (маскоўскае) тэлебачаньне рыхтавала вялікую праграму да Дня савецкай канстытуцыі. Такая імпрэза ладзілася штогод. У Маскву зьбіралі дыктараў і артыстаў з усіх пятнаццаці рэспублік. Гэтая шматгадовая цыклявая праграма называлася „Широка страна моя родная”.***

Вельмі адбілася ў памяці самая першая паездка на тую цыклявую імпрэзу. Паказваюць мне ў Астанкінскай студыі сцэнар. Вядоўцы павінны чытаць вершы нацыянальных паэтаў у перакладзе на расейскую мову. І вось рэпэтыцыя. Эстонская дыктарка Аліс Тальвік дэклямуе верш, які заканчваецца радком „Эстония – советская страна”. І раптам у яе вырываецца: – Эстония – моя страна! З націскам на слове „моя”. З апаратнай – лямант! Рэдактары, рэжысэр па гучнай сувязі тлумачаць, што такіх памылак рабіць нельга: гэта не твая, а савецкая краіна! Аліс нібыта ўсё разумее. На наступнай рэпэтыцыі кажа, як належыць. І вось – эфір. Даходзіць чарга да Аліс. Перад апошнім радком верша яна набірае як мага болей паветра і выдыхае: – Эстония – моя страна! Так і прагучала на ўвесь Савецкі Саюз. Эфір жа быў жывы. Для мяне гэта стала прыкладам патрыятызму, падказала, як трэба адстойваць сваё, нацыянальнае.

***Зінаіда Бандарэнка***

*23 жніўня 2006, паводле радыё Свабода*

## ЧАРГОВЫ АНТЫБЕЛАРУСКІ ДАКУМАНТ

Міністэрства акупацыйнай адукацыі падрыхтавала рашэньне пра перавод выкладаньня беларускай гісторыі на расейскую мову. Ад пачатку 1990-х незалежна ад мовы навучаньня школы прадмет „Гісторыя Беларусі „ выкладаўся толькі па-беларуску. Пазнаёміцца з праектам дакумэнту можна было ў „Настаўніцкай газэце”, але атрымаць камэнтар ад непасрэднага выканаўцы распрацоўкі можна будзе бліжэй да верасьня. Адказная за дакумэнт чыноўніца міністэрства Надзея Ганошчанка пайшла ў адпачынак. Тым часам у школах мала хто ведае пра пляны па пераводу «часткі» (зважай!) выкладаньня гісторыі Беларусі на расейскую мову. Напрыклад, дырэктарка менскай гімназіі нумар 23 Ніна Нікіціна папросту не паверыла такой інфармацыі: (Нікіціна:) „Абсурд роду чалавечага! (Гутарка вядзецца пра тое, што гэта і далей будзе пашырацца), бо гісторыю сваёй дзяржавы трэба вучыць на сваёй мове”.

P.S. У верасьні выявілася, што „абсурд чалавечага розуму” зацьверджаны і дзейнічае.

***(паводле Радыё «Свабода»)***

## У НАСЕЛЬНІЦТВА ПРАБЛЕМАЎ НЯМА

***Якая галоўная праблема стаіць перад школай у Беларусі?*** Гэтае пытаньне напярэдадні новага навучальнага году карэспандэнтка радыё Свабода задавала людзям на вуліцах Менску.

Адказы былі розныя, то матэматыка дрэнна выкладаецца, то вершыкаў па-руску мала задаюць. Ніхто (!) ні адзін чалавек не сказаў апытальшчыку, што няма беларускай школы.

Цемры, якая прышла да ўлады, спатрэбілася менш чым дванаццаць год каб пачаўся кашмарны сон.

***Т. Ракса***

## ВЕЛЬМІ ТРЫВОЖНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ

На пачатку лета прамаскоўскі рэжым выступіў з чарговай творчай ініцыятывай. Сотні турыстычных фірмаў і фірмачак РБ атрымалі загад „разьвіваць унутраны турызм для замежнікаў”. Шклоўцы вызначылі нават дапушчальныя прапорцыі. Цяпер, каб не адабралі ліцэнзію, турфірма

павінна прывезьці ў Беларусь ня менш як 20% замежных турыстаў ад колькасьці беларускіх грамадзянаў, вывезеных на экскурсіі і адпачынак за мяжу.

Задача аказалася надзвычай цяжкай. Арганізаваная Масквой і яе шклоўскімі марыянэткамі ізаляцыя Беларусі ад навакольнага сьвету даўно ўжо даецца ў знакі нашай краіне. Пустыя вакзалы, аэрапорты, гатэлі, турыстычныя і культурніцкія зоны – вось тыповая карціна нашай турындустрыі. Пра Беларусь, пра нашу культуру і гісторыю практычна ня ведаюць у сьвеце, бо ў сьвеце нас прадстаўляе варожая Беларусі лубянская „дыпляматыя". Узьвінчаныя кошты „для иностранцев" у гатэлях, тупізм ін'язаўскай абслугі таксама не спрыяюць актыўнасьці замежных турыстаў.

І што ж вы думаеце, турфірмы РБ выйсьце знайшлі. Беларусь на вачах становіцца другім Тайландам. Ня ў сэнсе тысячаў залатых пагад і белых сланоў. А ў зусім іншым сэнсе. Цяпер турапэратары разгарнулі рэклямную і практычную кампанію па арганізацыі масавага „сэкстурызму" у Беларусі, іншымі словамі масавай прастытуцыі. Нягоднікі ператвараюць Беларусь у сусьветны публічны дом. Да нас прылятаюць цэлыя самалёты кліентаў з Італіі, Нямеччыны, Францыі і іншых краінаў. Кліентаў прываблівають „высококваліфікаванай інтымнай абслугай" і „нізкімі коштамі". Пра кліентаў дбаюць сэкстурапэратары. Тлумачаць ім, што трэба карыстацца толькі дзяўчынамі ў гатэлях (яны пад кантролем), а не на вулічнай панэлі. Ахоўваюць кліентаў і іхны „кайф". „Дело пошло..." – бадзёра рапартуюць турфірмы гаспадарам нашай краіны. Дэмаралізацыя беларускай моладзі пастаўлена на канвэер.

Аднак, арганізатары і натхняльнікі прастытуцыі павінны ведаць аб судовай адказнасьці за свае дзеяньні, якая настане пасьля краху прамаскоўскага рэжыму. Цяпер жа трэба супрацiўляцца гэтаму зьнішчэньню народа ***ўсімі сродкамі і любымі мэтадамі.*** Трэба памятаць, што беларуская нацыя жыцьцёва трымаецца цяпер на жанчынах. Разбэшчваньне жанчын побач з павальным п'янствам мужчын прывядзе да таго, што народ ужо не падымецца. Перафразуючы Карнілава, руская брыдота зробіць больш чым рускі наган і рускі ГУЛАГ.

***Янка Базыль***

# „ПАТРЭБНА НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АСЬВЕТА І ЎЗМАЦНЕНЬНЕ БЕЛАРУСКАЙ СІЛЫ":

***(Выступ на ліпеньскім Сойме БНФ)***

Мы спадзяемся на перамены і стараемся набліжаць той час, калі разваліцца гэты антыбеларускі рэжым на Беларусі і зыйдзе ў нябыт. Тым часам мы павінны тлумачыць сябрам нашай партыі Фронту і прыхільнікам Адраджэньня, што ў выніку пераменаў і ў выніку ўпадку рэжыму Лукашэнкі да ўлады ў Беларусі могуць прыйсьці зноў антыбеларускія групы.

Такое становішча, як вы ведаеце, склалася пасьля 1999 года, калі ў выніку сумеснай расейска-нямецкай палітыкі (супрацоўніцтва КГБ і нямецкай разьведкі – Ганс Вік) быў расколаты Беларускі Народны Фронт і арганізавана новая ненацыянальная неадраджэнская „апазыцыя", кіруемая з Брусэлю і Масквы і выстаўленая як „альтэрнатыва рэжыму".

Масква, скарыстаўшы палітыку і фінансы Захаду, стварыла сабе беспройгрышны варыянт уплыву на беларускую палітыку і магчымасьць зноў аднавіць сваю ўладу ў Беларусі пасьля нейкага непрадбачанага (ці наадварот – падрыхтаванага) краху прамаскоўскага рэжыму Лукашэнкі.

Па вялікаму кошту, гэтая зьява, створаная Вікам і кампаніяй, ня ёсьць апазыцыяй, але зьяўляецца своеасаблівым аплочваемым лобі чужой палітыкі. Адсюль і характэрная (паказушная) манера захаваньня і адсутнасьць дэкляруемых палітычных вынікаў.

Мушу заўважыць, што дзейнасьць гэтай „апазыцыі" ня ёсьць цалкам адназначнай, дзякуючы ўцягваньню ў яе мерапрыемствы розных людзей. Але фактычна яна выконвае (зьнешне парадаксальным чынам) ахоўніцкую функцыю рэжыму Лукашэнкі. Найбольш значныя і шкодныя яе дзеяньні – гэта спрыяньне „элегантнай перамозе" Лукашэнкі на прэзыдэнцкіх выбарах у 2001 годзе шляхам выстаўленьня і падтрымкі заведама нікчэмнай кандыдатуры камуністычнага намэнклятуршчыка У. Ганчарыка, потым удзел у незаконным рэфэрэндуме аб трэцім тэрміне Лукашэнкі ў 2004 годзе і фактычнае спрыяньне яго вынікам. Нарэшце сёлетнія незаконныя выбары прэзыдэнта, калі лобі („апазыцыя") выконвала маскоўскую канцэпцыю „двух апазыцыйных лідэраў" і рэжыму „абмежавальнай планкі". Канцэпцыя (група Г. Паўлоўскага) прынесла добры вынік для Крамля – Лукашэнка захаваў прэзыдэнцтва і ўладу і адначасна скампрамэтаваў сябе фальсіфікацыяй, пахіснуў сваё становішча, стаў больш залежным ад Масквы. Цікава, што „лідэры" (Мілінкевіч, Казулін) выканалі ўсё (усе ўстаноўкі) да драбніц. Тым ня менш былі моманты, калі сітуацыя магла выйсьці з-пад тэхналягічнага кантролю. Гэта было належным чынам ацэнена ў Маскве і ў выніку прынята новая рэкамендацыя для рэжыму (той жа групай) – ліквідаваць нацыянальную грамадзянскую супольнасьць у Беларусі. Мы бачым, як пачалася інтэнсіфікацыя гэтага працэсу. Тут найбольш разбуральным і цалкам варварскім ударам зьяўляецца зьнішчэньне Саюзу пісьменьнікаў, ягонага архіву і бібліятэкі, а таксама ліквідацыя рэдакцыі Беларускай Нацыянальнай Энцыкляпэдыі. Гэта тыповы і агрэсіўны этнацыд, які нават не стараюцца замаскаваць.

Вяртаючыся да апазыцыйнага лобі ў апошняй кампаніі, зазначу, што рэжым дапусьціўся некалькіх памылак. Магчымасьць перакуліць рэжым (ці калі не перакуліць, то сьпіхнуць яго на край бездані) была двойчы: 19-га і 25-га сакавіка. Але абодва разы спраўна спрацавалі „два лідэры", якія „абнізілі планку" дакладна па тэхналёгіі. 19-га Мілінкевіч зьвёў дзесяткі тысячаў людзей з Цэнтральнай плошчы на Круглую плошчу „да вечнага агню" (гэта трэба ж было дадумацца), а 25-га яны абодва пры дапамозе рознай гэбоўскай драбязы, якая крычала „нет вражде", зьвялі народ з Цэнтральнай плошчы ў цесны сквер імя Янкі Купалы. Потым Казулін павёў людзей яшчэ далей на вул. Акрэсьціна „падтрымаць арыштаваных". І не было каму спыніць гэты абсурд. Так былі ліквідаваныя магчымасьці супольных дзеяньняў у патрэбным месцы. (Мой заклік да Плошчы праз Інтэрнэт – гэта быў ужо крык сьмагнучага ў пустыні). Спробы „двух лідэраў" зьвесьці прэч беларускую змагарную моладзь з намётавага лягеру на плошчы Каліноўскага ім, аднак, не ўдалася. Але, як пісаў журналіст Ігар Карней, у выніку такіх паводзінаў „23 сакавіка група моладзі самахоць пакінула лягер. Такім чынам яны выказалі сваё стаўленьне да пасіўнасьці апазыцыйных кандыдатаў на прэзыдэнта – А. Мілінкевіча і А. Казуліна. Моладзь тлумачыла: зь першых кантактаў з гэтымі палітыкамі стала зразумела, што тыя не гатовыя да радыкальных крокаў і не ўяўляюць, куды і як скіраваць энэргію пратэсту. Адсутнасьць рэальных прапановаў з боку дэмакратычных „лідэраў" агаломшыла некаторых жыхароў намётавага лягеру" (радыё „Свабода", 24 чэрвеня 2006 г.).

Цікава прасачыць далейшыя выказваньні Мілінкевіча, дзе ён (магчыма сам таго не ўсьведамляючы) фактычна закладвае маскоўскіх паліттэхнолягаў. 30 і 31 траўня, напрыклад, тэлеканал „Эўраньюс" штогадзіну круціў інтэрв'ю зь Мілінкевічам, які наведаў яго расейскую рэдакцыю. „Наша кааліцыя імкнулася стрымаць вулічныя пратэсты пасьля выбараў,– сказаў Мілінкевіч. – Для нас ня гэта ёсьць галоўным, а галоўнае – гэта справядлівыя выбары". (Зазначым, што справядлівыя выбары ва ўмовах дыктатуры ў прынцыпе немагчымыя і гэта агульнавядомая праўда.)

Тым часам тэхналёгія „двух лідэраў" і „планкі" працягваецца далей (гл. „Беларускія Ведамасьці" №2 (56) за гэты год, стар. 8, артыкул „Чужая палітыка"). З гэтага гледзішча часам цікава пачытаць ў Сеціве шчырасьці агентуры. Напрыклад: „Для Козулина главное – перетерпеть. Он выйдет к концу 2007 – началу 2008 года, как раз в тот момент, когда власть Лукашенко начнёт стремительно рушиться. Тогда он и возглавит при помощи, например, России демократическую революцию. Но пока Козулин в тюрьме, лидер один – Милинкевич. Это технологически верно. Цели ясны, структура управления сформирована" (П. Шарамет).

Думачкі і стыль зразумела адкуль. Гэтая публічка, вядома, не прафэсіяналы (не Няўзораў і не Дарэнка і нават не Кісялёў), але яна добра даказвае

адну парадаксальную ісьціну аб карысьці балбатуноў у палітыцы, асабліва калі яны ў стане ворага.

Аднак вынішчэньне беларускай нацыі плянуюць разумныя і адукаваныя ворагі, а выконваюць цемра і нягоднікі. Перш за ўсё мы павінны выразна разумець якраз гэтыя пляны, сістэму, прычыны, што і чаму робіцца, а потым ужо рэагаваць на дзеяньні.

Іншая справа, што ў асяроддзі апазыцыйнага лобі ёсьць пэўная частка людзей, якая шчыра шукае вольнай незалежнай Беларусі і беларускіх лідэраў (паколькі Фронт інфармацыйна ізаляваны). Парадоксы гэтага сьляпога шуканьня прыводзяць да таго, што некаторыя патрыёты гатовыя былі пайсьці ня тое што за русафілам Казуліным ці безыдэйным Мілінкевічам, але нават за рускім генэралам Фраловым, не зважаючы на ўсе клясічныя асаблівасьці савецкага генэральскага інтэлекту.

Наяўнасьць такіх людзей у апазыцыйным лобі трэба ўлічваць, але ня мець ілюзіяў. Большы вынік будзе мець агульнае нацыянальнае асьветніцтва. Але рашучы паварот зробіць толькі ўзмацненьне і дамінаваньне магутнай нацыянальна-дэмакратычнай адраджэнцкай сілы.


*Менск, сакавік 2006 г. Антыбеларускі рэжым*

З гэтага вынікае, што нам ня трэба марнаваць час на палітычнае змаганьне з падстаўной апазыцыяй. Гэта не наша задача. (Масква толькі парадавалася б). Акрамя таго, гэта бясэнсоўна. Бо ў іх не палітычная, а выгадніцкая прырода. Наша задача – раскрываць і паказваць грамадзтву палітычную сутнасьць падстаўной апазыцыі і выгадніцкі зьмест яе імітацыі, чаму адсутнічаюць вынікі і рэальнае змаганьне і г.д.

Але галоўны кшталт нашай дзейнасьці цяпер – нацыянальна-дэмакратычная асьвета беларускіх людзей, ідэйна-палітычнае, арганізацыйнае і кадравае ўзмацненьне нашай партыйнай і ў цэлым адраджэнцкай сілы.

Тым часам расейцы напралом хочуць увесьці свой рубель на Беларусі, пры гэтым рыхтуюць зрабіць гэта праз прыняцьце так званага „канстытуцыйнага акту" на рэфэрэндуме.

Незаконны рэфэрэндум зноў, відаць, захочуць сумясьціць з выбарамі ў мясцовыя органы ўлады. Наша пазыцыя тут зразумелая і выразная. Нельга ўдзельнічаць у такіх выбарах і рэфэрэндуме. Але дзеяньні нашы павінны быць актыўнымі: заклікаць людзей у дзень выбараў не галасаваць, а выйсьці на плошчы і вуліцы, каб актыўна засьведчыць свой няўдзел ў выбарах і кансалідаваць сілу супраць прамаскоўскага рэжыму на Беларусі.

***Зянон ПАЗЬНЯК***

*9 ліпеня 2006 г.*

# ГІСТАРЫЧНЫ ПРЫКЛАД ЗМАГАНЬНЯ

2 жніўня 2006 г. Нарвэжская газэта "Aftenposten" друкуе артыкул прысьвечаны ўгодкам пачатку глыбокага крызісу Брытанскай імпэрыі. 50 гадоў таму, ў жніўні 1956 г. прэзыдэнт Эгіпту Гамаль Абдэль Насэр абвясьціў аб нацыяналізацыі Суэцкага каналу (пабудаванага ў 1869 г. ангельцамі і французамі, якія валодалі ім нягледзячы на дзяржаўную незалежнасьць Эгіпту). У адказ Брытанія, Францыя і Ізраіль у лістападзе 1956 г. пачалі ваенную інтэрвэнцыю супраць Эгіпту. Але ЗША не падтрымалі нэакаляніялісцкую апэрацыю сваіх хаўрусьнікаў, заходнікі былі вымушаны пагадзіцца з паразай і адступленьнем. Брытанія канчаткова згубіла свае ўплывы на Бліжнім Усходзе, дзе гаспадарыла на працягу паўтара стагоддзяў. Яе сусьветная імпэрыя пачала сыпацца на вачах.

Наш камэнтар: Эгіпецкі народ абараніў сваю маёмасьць і дзяржаўную незалежнасьць, нягледзячы на тое, што эгіпецкая армія была значна слабей узброена і колькасна меншая за ворагаў. Але ўпэўненасьць у сваёй праўдзе і патрыятычны ўздым былі настолькі магутнымі, што перамагчы эгіпцянаў ня здолелі нават эканамічна разьвітыя каляніялісты. Важным аспэктам нацыянальнай абароны была таксама непахісная пазіцыя нацыянальнага лідэра Насэра, які не пабаяўся адказнасьці і мабілізаваў народ на барацьбу і перамогу. Брытанская імпэрыя, якая здавалася вечнай і непахіснай, атрымала апошні ўдар ад вызваленых народаў. Падобна на тое, што маскоўская імпэрыя (якая таксама некаму падаецца вечнай) пачне валіцца менавіта пасьля правалу крамлёўскай каляніяльнай авантуры ў Беларусі. Адбудзецца гэта, калі адраджэнская беларуская моладзь і актыўныя патрыёты Бацькаўшчыны стануць ў авангардзе барацьбы за вызваленьне Айчыны ад захопнікаў і прамаскоўскай хунты. А ўзначаліць вызваленьне сапраўдны нацыянальны лідэр, а не падстаўныя імітатары.

***Юрка Марозаў***

**З Ь М Е С Т**


1. Зянон Пазьняк. Альтэрнатывай рэжыму ёсьць змаганьне . . . . . . . . . . 1
2. Не галасаваць для дыктатуры, а яднацца за Беларусь. . . . . . . . . . 2
3. Сяргей Навумчык. Аднаўленьне незалежнасьці ў жніўні 91-га: хроніка падзеяў . . . . . 3
4. Сяргей Навумчык. З. Пазьняк: „Мы павінны гэты сьцяг і гэрб берагчы як сьвятое.". . 3
5. Зянон Пазьняк. Каб перамагчы антыбеларускі рэжым, трэба стварыць беларускую нацыянальную сілу. . . . . . . . . . 4
6. Валеры Буйвал. Сьвятая Ворша. . . . . . . . . . 5
7. Зянон Пазьняк. Незалежнасьць і нацыянальная асьвета. . . . . . . . . . 7
8. Валеры Буйвал. Пакт супраць Беларусі . . . . . . . . . . 8
9. Янка Базыль. Чарговае прызнаньне Віка . . . . . . . . . . 8
10. Зянон Пазьняк. Канфлікт на маскоўскай дарозе . . . . . . . . . . 9
11. Беларусы на чорнай працы ў Расеі . . . . . . . . . . 10
12. „Яны адпомсьцяць за ўсіх пакутнікаў." . . . . . . . . . . 10
13. Прээзэнтацыя кнігі Сяргея Навумчыка . . . . . . . . . . 10
14. Ганна Соусь. Прэміі ПЭН-цэнтру Сяргею Навумчыку і Леаніду Маракову. . . . . . . . 11
15. Галіна Пазьняк. Аповяд чыстага сумленьня . . . . . . . . . . 11
16. Зянон Пазьняк. Адказнасьць і салідарнасьць. . . . . . . . . . 14
17. Мірон М. „Ціха – ціха пагуляем" . . . . . . . . . .14
18. Зінаіда Бандарэнка. Вучымся ў эстонцаў . . . . . . . . . . 14
19. Чарговы антыбеларускі дакумант . . . . . . . . . . 14
20. Т. Ракса. У насельніцтва праблемаў няма. . . . . . . . . . 14
21. Янка Базыль. Вельмі трывожная інфармацыя . . . . . . . . . . 14
22. Зянон Пазьняк. „Патрэбна нацыянальная асьвета і ўзмацненьне беларускай сілы." . . . . . . . . . . 15
23. Юрка Марозаў. Гістарычны прыклад змаганьня . . . . . . . . . . 16



*Нумар аддрукаваны пры падтрымцы беларускай фундацыі імя Рамуальда Траўгута.*

Беларускія Ведамасьці

Беларускае выданьне

У супрацоўніцтве зь Беларускім Выдавецкім Таварыствам ў Амэрыцы

**Рэдакцыя: Зянон Пазьняк, Галіна Палачаніна**

**Адрас рэдакцыі: 02-017 Warszawa, Al. Jerozolimskie 125/127**

**тэл./факс: (+48 22) 628 76 73**